РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 САКАВІКА 2025 г. СУБОТА № 42 (30430)

ФОРМУЛА СПРАВЯДЛІВАГА ЦЭНАЎТВАРЭННЯ

Менавіта яе разглядалі ўчора на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы. Размова Аляксандра Лукашэнкі з прысутнымі на ёй была сур'ёзная і нават жорсткая. Галоўнае патрабаванне Прэзідэнта — захаваць баланс інтарэсаў усіх і рэгуляваць цэны выключна ў каляі справядлівасці.

(Падрабязнасці на стар. 2–3)

У НАГУ З ЧАСАМ

РУЧНАЯ РАБОТА

Кажуць, штучны інтэлект, які пераможна крочыць па планеце, хутка зробіць незапатрабаванымі многія «інтэлігентныя» прафесіі. Але ён ніколі не зможа замяніць таго, хто стварае матэрыяльныя даброты, працуе рукамі. Нездарма менавіта пра людзей, якія могуць і ўмеюць якасна змайстраваць або падрамантаваць, у народзе спрадвеку кажуць — «залатыя рукі».

Таму і мяняецца сёння стэрэатып пра абавязковую наяўнасць вышэйшай адукацыі як пра галоўны складнік жыццёвага поспеху. Паводле статыстыкі, кожны другі выпускнік дзявятага класа выбірае працягваць адукацыю ў каледжы, вялікая частка якіх навучае менавіта рабочай прафесіі. І ўсё не так лёгка — у наш час нават да рабочых спецыяльнасцяў прадпрыемствы і спажыўцы прад'яўляюць павышаныя патрабаванні. Як сказаў учора на нарадзе Прэзідэнт: «Сёння абы-каго — гэта не савецкія часы — на работу не возьмуць. Патрэбны чалавек, які будзе даваць вынік».

Дзе і хто падрыхтуе такіх спецыялістаў, прычым усіх, хто жадае навучыцца працаваць рукамі, — пытанне актуальнае і важнае. Бадай што не менш, чым развіццё штучнага інтэлекту.

СТАР. 8–9

Фота БелТА.

ВЫБІРАЕМ ПАДАРУНКІ НА 8 САКАВІКА

13

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ШТО ЗМЕНІЦЦА З 1 САКАВІКА

У першы дзень вясны ў старшынь райвыканкамаў пашырацца паўнамоцтвы, аграрыі выходзяць на фінішную прамую падрыхтоўкі да пасяўной і павінны паставіць на лінейку гатоўнасці адпаведную сельскагаспадарчую тэхніку, прыбаўку ў зарплатах адчуюць медыцынскія сёстры і фельчары, а рамеснікам і самазанятым упершыню трэба будзе заплаціць узносы ў ФСАН. Расказваем пра гэтыя і іншыя змяненні.

СТАР. 8–9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

«СПРАВЯДЛІВАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ЦЭН —

Прэзідэнт Беларусі праверыў «дамашняе заданне», якое даваў ураду

На нарадзе ў кіраўніка дзяржавы абмеркавалі формулу справядлівага цэнаўтварэння, якую было даручана распрацаваць. Новая сістэма рэгулявання цэн — пытанне найважнейшае і для кіраўніцтва краіны, і для насельніцтва. Таму і размова выйшла прынцыповая, прамая, месцамі нават жорсткая.

«На першы погляд, гэта цяпер не так актуальна для Беларусі, як у 2022 годзе. Тады мы назіралі адкрытую цэнавую вакханалію. Прыйшлося ўмешвацца Прэзідэнту, каб спыніць гэта самавольства ўльтыматыўна. Імем рэвалюцыі. Спынілі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Больш за тое, насуперак панікёрам-скептыкам, якія крычалі, што крамы апусцеюць і закрыюцца, усе засталіся працаваць. Ды і тавары асартымент мы не толькі захавалі, але і пашырылі з часам. І калі недзе нешта не так, значыць, мы вінаватыя. І не трэба тут наракаць на нейкія эканамічныя прычыны».

ВЫБРАНАЯ Ў 2022 ГОДЗЕ МАДЭЛЬ ЗАДАЧЫ ВЫКАНАЛА

Калі інфляцыя пачала расці, Прэзідэнт запатрабаваў заняцца цэнамі і трымаў гэта пытанне на пастаянным кантролі. Дзякуючы жорсткім патрабаванням і пільнаму кантролю праблему вырашылі. «Па сутнасці, быў створаны комплексны дакумент (як лічаць ва ўрадзе) па рэгуляванні спажывецкага рынку, які закранаў не толькі пытанні цэнаўтварэння. Калі б гэта быў комплексны дакумент, не было б столькі скаргаў з боку вытворцаў, прадаўцоў і іншых», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў: гэта не значыць, што ўсе скаргі абсалютна правамерныя і аб'ектыўныя, паколькі цэны ў Беларусі нізкія.

«Калі ў цябе сёння няма грошай для таго, каб нешта купіць (а цэны ў нас самыя нізкія ў свеце, яны, можа быць, не задавальняюць усіх, але гэта самыя нізкія цэны ў свеце), дык ідзі працуй. Ідзі на другую, на трэцюю работу. Калі цябе не бяруць, давай паглядзім, як ты ў школе вучыўся, што ў цябе ў галаве ёсць. Сёння абы-каго — гэта не савецкія часы — на работу не возьмуць. Патрэбны чалавек, які будзе даваць вынік. З гэтага пункту гледжання, стань перад люстэркам, паглядзі на сябе: ці зможаш ты даваць гэты вынік? Вось такая непапулярная пазіцыя, але яна жыццёвая», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Жыццё паказала, што выбраная ў 2022 годзе мадэль выканала пастаўленыя перад ёй у крытычны момант задачы. Але беларускі лідар акцэнтаваў увагу на тым, што краіна мае сёння. І прывёў лічбы. Па даных статыстыкі, у 2024 годзе інфляцыя склала 5,2 % пры запланаваных 6 %. 2025 год пачалі таксама спакойна. «Пры гэтым трэба ўлічваць, што мы дырэктыўна падымаем некаторыя цэны. Вазьміце цэны на ЖКГ, паліва, іншыя кірункі. Мы жорстка іх кантралюем, і без дазволу ўлады цэны не растуць. Дарэчы, у нас адзін з самых нізкіх паказчыкаў сярод краін — удзельніц Садружнасці». Аднак кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў ланцужку ад сыравіны да прадукцыі не ўсё ёсць у краіне. Шмат чаго прыходзіцца купляць па імпарце. А ў тых краінах, дзе купляем, інфляцыю мы не рэгулюем. Таму, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, даводзіцца купляць па той цане, якую прапаноўваюць.

ЛЮДЗЯМ ПАВІННА БЫЦЬ ПА КІШЭНІ САМАЕ ПРОСТАЕ

Разам з тым па некаторых групах тавараў, якімі можам забяспечваць сябе самі, статыстыка не вельмі аптымістычная, падкрэсліў беларускі лідар. Гаворка перш за ўсё аб гародніне. Цэны на яе зімой штогод павышаюцца на 15—20 працэнтаў. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на яго ўзроўні тэма ўжо абмяркоўвалася раней. Тады ўрад абяцаў вырашыць праблему, каб была забяспечанасць айчыннай агароднінай зімой. «Павінен быць вынік. А як вынік — на 20—30 % у вас рост цэн па тых таварах, якія мы самі можам вырабіць», — абурыўся Прэзідэнт. Па яго словах, кожнаму зразумела: цэны растуць, таму што тавараў не хапае. Але адказныя асобы дакладваюць, што тавараў хапае. Разам з тым цэны працягваюць расці. «Значыць, мы дрэнна працуем. Мы працуем агідна», — канстатаваў Прэзідэнт, заўважыўшы, што ў справаздачах чыноўнікаў усё добра.

«А хто разабраўся з затратамі? — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. — Калі ў гаспадарцы цяпліца і там мінус восем сабекошт атрымаўся, дык вы паглядзіце, можа, на гэту цяпліцу спісалі незразумелыя затраты. Вы паглядзелі, з чаго складаецца гэты сабекошт?»

Прэзідэнт паставіў жорсткую задачу — уважліва разглядаць, што вытворца закладвае ў сабекошт, аналізаваць, каб там не было нічога лішняга. Ён заўважыў, што нярэдка гаспадары гандлёвых сетак жывуць на шырокую нагу, а кошт прыгожага жыцця закладваюць у сабекошт тавараў, якія прадаюць у сваіх сетках.

«Давайце паглядзім, які сабекошт агурка, памідора, і вызначым (калі ўжо з практыкі зыходзіць) гаспадаркі, на якія павінны раўняцца ўсе. Тады горшыя будуць вымушаны падцягнуцца. А тыя, хто пасярэдзіне, будуць нармальна жыць. Хто сёння мне скажа, які сабекошт гэтага агурка і памідора, калі аб гэтым казаць? Ніхто. І не спрабуйце мне даказаць гэта», — адзначыў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу і на будаўніцтва цяпліц, у якіх можна вырошчваць агародніну нават не ў сезон. Па словах кіраўніка дзяржавы, з гэтым няма ніякіх праблем: «Кажу гэта таму, што ў мяне кавалак гэтай цяпліцы ёсць. Я ў тыдзень тры разы бачу, як растуць памідоры і агуркі. Ужо месяц таму з'явіліся агуркі. Памідоры праз месяц-паўтара будуць. Але той, хто займаецца прафесійна гэтым, ужо сёння мае памідоры. І мы можам такім чынам збіць цэны. Кавалачак цяпліцы ўзяў, каб бачыць, магчыма гэта ці не. Аказваецца, магчыма. А чаму вы не робіце?».

Прэзідэнт папрасіў далажыць аб сітуацыі і прынятых мерах па даступнасці вітамінавай прадукцыі для насельніцтва.

«Я не прашу вас рэгуляваць прывазную экзотыку, усякія там артышокі ці авакада. Няхай гэта авакада каштуе столькі, колькі каштуе, — зрабіў акцэнт кіраўнік дзяржавы. — Людзям павінна быць па кішэні самае простае: капуста, цыбуля, бульба, морква, яблыкі».

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра свае даручэнні наконт стабілізацыйных фондаў і забеспячэнне насельніцтва прадуктамі, закладзенымі ў сховішчы ў асенне-зімовы перыяд. Яны выкананы не былі. А ў той жа час у несезон падаражэла тая ж бульба — за два месяцы на 10 %.

«Мы што, не можам вырасціць бульбы пэўную колькасць, пакласці ў склеп і потым прадаць насельніцтву?» — абурыўся кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што айчынная бульба нічым не горшая за імпартную, трэба проста правільна яе захоўваць.

«Выбудавалі сістэму так, што імпарт больш выгадна завозіць у гандаль, чым прадаваць сваё. Не так? Гэта ж бардак! Якое гэта рэгуляванне? Гэта карупцыя. Якому імпарцёру, які з Егіпта ці Расіі, Казахстана завозіць тавар, вы хацелі падыграць? Дакажыце мне, што ён вам не заплаціў штосьці, на лапу не паклаў. Я, вядома, не збіраюся вас папракаць у тым, што вам давалі хабар, але, прабачце, гэта падазрэнне», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, стабілізацыйныя фонды ствараюцца для таго, каб трымаць на звычайныя беларускія тавары нармальную цану, для таго, каб рэгуляваць попыт.

УСЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ У РОЎНЫХ УМОВАХ

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што формула справядлівага цэнаўтварэння — гэта галоўны экзамен для ўрада. «На нас глядзяць людзі, нас падтрымліваюць. Мы ўсе ўзахлёб радаваліся таму, што за нас прагаласавалі на апошніх выбарах. А мы што? — заявіў ён. — Яшчэ раз паўтараю: ідзе прызначэнне ва ўрад — момант, сыходзьце. Сядзяць, выдумляюць нейкую формулу, і ў кожнага сваё меркаванне ў галаве. Прэзідэнт паставіў задачу і намаляваў каляю, з якой вы не можаце выскачыць: у нас дыктатура. І гэту дыктатуру народ падтрымлівае. Рабіце».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не павінна быць жорсткіх мер рэгулявання, каб не нашкодзіць эканоміцы: «Мы не павінны празмерна стрымліваць цэны ў вытворцаў тавару. Там павінна быць нармальная рэнтабельнасць, а яна з сабекошту і тых жа цэн складаецца. Але галоўнае — гэта рэнтабельнасць складваецца з затрат. Скарачайце затраты. Разбэсціліся да неймавернасці». Прэзідэнт запатрабаваў паставіць усіх у роўныя ўмовы і не забываць, што краіна — вышэй за ўсё.

Кіраўнік дзяржавы агучыў і прапановы бізнесу па гэтай тэме: заціснуць дзяржаўныя прадпрыемствы, а на попыт-прапанову будуць працаваць прыватныя.

«Учора крычалі: «Пастаўце нас у роўныя ўмовы, дзяржаўныя і прыватныя прадпрыемствы». А сёння кажуць: «Не, у нас тут поўная свабода, ніякіх рэгуляванняў быць не павінна, а дзяржаўныя зацісніце». Дык чаго прыватнікі хочуць? Стаўленне да прыватных і дзяржаўных прадпрыемстваў павінна быць аднолькавае — жорсткае, у інтарэсах людзей, — заявіў ён. — Роля дзяржавы з гэтага часу павінна заключацца не ў наглядзе, а ў стварэнні зразумелых умоў працы і агульных правіл паводзін для ўсіх удзельнікаў рынку».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ніхто не павінен бегаць ва ўрад і прасіць адрэгуляваць цану. «Бізнесмены, вытворцы павінны самі ўстанаўліваць цану на прадукцыю. Але ў іх таксама павінна быць каляя, каляя справядлівасці», — заўважыў ён. Таму ўраду і было даручана выпрацаваць новую формулу справядлівага цэнаўтварэння. Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што трэба адыходзіць ад думкі «да выбараў папрацуем, а пасля выбараў усё пойдзе само сабой, як заўсёды было» — за падобнае спытае жорстка. «Папярэджваю

ПЫТАННЕ НАЙВАСТРЭЙШАЕ»

і адказным за эканоміку службовым асобам

вас: дурыць людзей нікому не дазволена. Я за гэта першым нясу персанальную адказнасць. Члены ўрада, губернатары — у другую чаргу», — сказаў ён.

УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ У КАЛЯІ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе члены ўрада — зямныя людзі, якія перажываюць, як жывуць простыя беларусы. І трэба ім дапамагчы. Пры гэтым, па словах кіраўніка дзяржавы, не трэба глядзець на іншыя краіны, трэба вырашаць свае пытанні.

«Нам няма чаго на іх раўняцца. Расія, калі захоча, найбагацейшай краінай будзе. Амерыканцы захочуць — надрукуюць колькі трэба долараў. Еўрапейцы — тэхналагічныя краіны, адбудаваныя. Прыйдуць нармальныя кіраўнікі, будзе Еўрапейскі саюз працаваць.

А нам што рабіць у гэтым атачэнні? Ваяваць, як ва Украіне? Усё пачынаецца з эканомікі, дваццаць пяты раз аб гэтым кажу», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы агучыў, што падразумяваецца пад справядлівасцю і прадстаўленай урадам формулай справядлівага цэнаўтварэння.

Па-першае, для спажыўца, простага чалавека справядлівасць заключаецца ў адсутнасці спекуляцый і ў разумнай цане на канчатковы прадукт. Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што прадукцыя для спажыўца павінна быць даступнай. Хто хоча, няхай купляе імпартныя брэнды. Але ў Беларусі вырабляюць сваю якасную прадукцыю. І менавіта свае тавары павінны быць даступнымі для пакупнікоў.

Па-другое, для прадпрыемстваў справядлівасць павінна ўлічваць адэкватны прыбытак. «Натуральна, у страту ніхто не павінен працаваць. Але прыбытак — гэта цана мінус затраты. Зноў затраты. Хочаце большы прыбытак — перасаджвайцеся з «мерседэса» на сівога каня, я па-народнаму кажу. Трэба, каб цана ў вытворцы была, каб яны маглі інвеставаць у развіццё, годныя зарплаты сваім работнікам плаціць», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што цана на тавар — гэта заработная плата работнікаў на прадпрыемствах. Больш за тое, ад памеру атрыманага прадпрыемствамі прыбытку залежаць і даходы дзяржаўнага бюджэту. А гэта — зарплаты вялікай катэгорыі работнікаў і гарантаванне нацыянальнай бяспекі.

Па-трэцяе, для гандлю справядлівасць — гэта максімальнае садзейнічанне продажам айчынных тавараў. «Мы ўзялі курс на буйныя сеткі. Там таксама цана бандыцкая была, ніхто не кантраляваў. Усім было добра ў гандлі і ўсім, хто быў звязаны з ім. Таму там таксама фарміруецца канчатковая цана для спажыўца. Але я ўжо казаў: не павінна быць так, што імпартнае сёння больш выгадна прадаваць, чым айчыннае. І мы шукаем прычыну. Камітэт дзяржкантролю, урад — усе шукаюць прычыну. Але яна на паверхні — вы самі стварылі такія ўмовы. І мы губляем айчынны рынак», — заўважыў Прэзідэнт.

«ЗА ВЫНІК АДКАЖАЦЕ ГАЛАВОЙ»

Падсумоўваючы, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў новай, справядлівай, сістэме цэнаўтварэння павінен захоўвацца баланс усіх інтарэсаў. «Я вас аб гэтым і прасіў: зрабіце такую сістэму, каб гэты баланс захоўваўся. Урадам прапанавана пакуль толькі агульнае бачанне формулы справядлівай цаны», — адзначыў ён. Чакана, у яе ёсць як прыхільнікі, так і скептыкі. Ацэнкі гучаць розныя. Ад немагчымасці ўвасобіць новую формулу ў жыццё і да неабходнасці захавання звыклай цяперашняй сістэмы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што, калі баяцца прымяняць нешта новае, прагрэсу не будзе. Аднак у цэлым эксперты сыходзяцца ў меркаванні, што падыходы існуючай сістэмы трэба ў той ці іншай ступені карэкціраваць. А разумны кантроль за цэнамі павінен быць захаваны. «Вы ўвогуле можаце не кантраляваць, ваша справа. Але за вынік адкажаце галавой. Новы ўрад перш за ўсё. І не толькі», — папярэдзіў Прэзідэнт. Ён прывёў прыклад.

На сёння па выніках розных даследаванняў відаць, што насельніцтва вельмі хвалюе рост цэн на лекі і адзенне. Гэта для людзей самыя адчувальныя пазіцыі. «Што, ва ўрадзе гэтага не ведаюць? Дык вазьміце гэтыя дзве пазіцыі і адрэгулюйце. Чаго мы чакаем?» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка настроіў удзельнікаў нарады разгледзець прапановы ўрада дэталёва і пакрокава, каб выпрацаваць аптымальныя рашэнні. «Майце на ўвазе, пытанне найвастрэйшае, яно пастаянна на вачах у нашага насельніцтва. Адступленне ад гэтай праблемы з майго боку не будзе ніколі. Таму што гэта жыццё людзей», — папярэдзіў беларускі лідар.

ТРЭБА ПРАПІСАЦЬ ПРАВІЛЫ ДЛЯ ВЫТВОРЦАЎ

Першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў найперш расказаў пра сітуацыю з цэнамі на гародніну. Па яго словах, на дадзены момант яны поўнасцю знаходзяцца ў рамках цэн, устаноўленых на студзень — сакавік. «Павышэнне, натуральна, ёсць. Але і затраты на захоўванне ёсць. Імпартныя надбаўкі ніякім чынам не ўплываюць на гародніну і стабілізацыйныя фонды. Больш уплывае тое, што ў Расіі цэны вышэйшыя і нашы вытворцы актыўна прадаюць там. Гэта пытанне кантралюецца», — адзначыў ён. Першы віцэ-прэм'ер таксама заўважыў, што цэны на агуркі знізіліся на 10 %. А для таго, каб краіна магла мінімум напалову сама сябе забяспечваць агароднінай, будуецца больш цяпліц. Плануецца, што паловай з гэтага ўраджаю краіна будзе забяспечваць сябе, а палову — экспартаваць.

«Жаль, в эту пору прекрасную, Мікалай Генадзьевіч, жить не придется ни мне, ни тебе», — іранічна заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Але адказныя чыноўнікі запэўнілі Прэзідэнта, што праблема з агуркамі ўжо вырашана. Пакуль ёсць пытанне па забеспячэнні памідорамі, але яно вырашаецца. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў цэлым пытанняў па вырошчванні гародніны быць не павінна. Усё ёсць, каб забяспечваць беларусаў сваёй прадукцыяй. Ёсць прадпрыемствы, якія займаюцца цяпліцамі, ёсць спецыялісты.

Аднак толькі на гародніне ўдзельнікі нарады не спыніліся. У цэнтры ўвагі ў цэлым былі цэны на тавары, якія часцей за ўсё купляе насельніцтва, — мясная і малочная прадукцыя, адзенне. Сваім меркаваннем на гэты конт падзяліліся не толькі члены ўрада, але і губернатары, якія бачаць рэальную карціну на месцах і непасрэдна працуюць з вытворцамі. У вырашэнні вельмі актуальнага для краіны пытання трэба прыняць да ўвагі ўсе пункты гледжання.

Прэзідэнт прапанаваў у вытворчасці розных тавараў узяць за прыклад пэўнае прадпрыемства з нармальнай рэнтабельнасцю, годнай зарплатай, інвестыцыямі і раўняцца на яго. «Вы не павінны ні падымаць, ні апускаць цэны. Гэта яны (вытворцы. — **«Зв.»**) павінны рабіць. Але для іх трэба прапісаць правілы, каб вы ўмешваліся ў выключных выпадках, калі ёсць нейкія скаргі. Усё астатняе — калі ласка», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён параіў чыноўнікам, выпрацоўваючы формулу рэгуляванння цэн, больш размаўляць з вытворцамі, аналізаваць, што яны кажуць.

Удзел у нарадзе прынялі і прадстаўнікі прадпрыемстваў, якія падзяліліся сваімі напрацоўкамі, меркаваннямі і нават прапановамі наконт рэгулявання цэн. Палеміка падчас нарады была вельмі актыўнай і нават эмацыянальнай. Па некаторых пытаннях не абышлося і без спрэчак — усё ж такі ўсе зацікаўлены ў выпрацоўцы сістэмы, якая будзе эфектыўнай і прыносіць карысць. А рэгуляванне цэн — тэма вельмі тонкая, звязаная з многімі эканамічнымі аспектамі. ***Асноўнае патрабаванне Прэзідэнта да ўсіх адказных — захаваць баланс інтарэсаў усіх і рэгуляваць цэны выключна ў каляі справядлівасці.***

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота БелТА.

У тэму

У ДАПРАЦОЎЦЫ СІСТЭМЫ РЭГУЛЯВАННЯ ЦЭН ПАВІННЫ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ УСЕ

«Для Прэзідэнта ўсё, што звязана з забеспячэннем сацыяльных стандартаў жыцця кожнага чалавека, — пытанне нумар адзін», — заўважыў у размове з журналістамі **першы віцэ-прэм'ер Мікалай СНАПКОЎ,** які расказаў пра вынікі бурнай дыскусіі. Дарэчы, размова працягвалася каля трох гадзін.

«Урад прапанаваў два варыянты: першы — кароткатэрміновы, другі — сяроднетэрміновы. Кароткатэрміновы пабудаваны на прапанове бізнесу, з якім мы вельмі цесна, дэталёва адпрацоўвалі падыходы, якія б задавальнялі бізнес», — расказаў Мікалай Снапкоў. Менавіта гэты падыход урад вынес на разгляд кіраўніка дзяржавы. Згодна з ім, прапаноўваецца карэкціраваць існуючую сістэму рэгулявання цэн, правесці работу над памылкамі, нівеліраваць скажэнні і дысбалансы, якія выявіліся на практыцы. «Прэзідэнтам прыняты такі падыход, даручана яго дапрацаваць сумесна з дзяржаўнымі органамі, аблвыканкамамі і бізнесам і ўнесці на разгляд да 1 красавіка, лепш — да 25 сакавіка. Работа, у прынцыпе, нескладаная, зразумелая. Што трэба адкарэкціраваць, мы разумеем», — заявіў Мікалай Снапкоў.

Першы віцэ-прэм'ер расказаў, у чым заключаецца прапанова на сяроднетэрміновую перспектыву. Тут галоўнае — фарміраванне рэспубліканскай сістэмы абароту тавараў, работ і паслуг. Мікалай Снапкоў адзначыў, што сёння ў краіне ўжо рэалізоўваецца некалькі платформ. Гэта платформа нагляду за таварамі, платформа маркіроўкі тавараў, электроннай рахунак-фактуры і сістэма СККА (сістэма кантролю касавага абсталявання). «Інтэграваўшы гэтыя сістэмы, зрабіўшы іх «прыязнымі», мы атрымліваем адзіны гандлёвы дакумент, па якім аналітычны цэнтр будзе бачыць увесь рух тавараў, работ і паслуг у краіне. Асноўная мэта стварэння такой платформы — гэта адсочванне дабаўленай вартасці ў ланцужку руху тавару», — растлумачыў Мікалай Снапкоў.

Старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна МЯДЗВЕДЗЕВА расказала, што па выніках нарады было прынята рашэнне дапрацаваць існуючую сістэму рэгулявання цэн. «Пры гэтым пастаўлена задача, каб у дапрацоўцы ўдзельнічалі абсалютна ўсе: як губернатары, якія ведаюць сітуацыю ў рэгіёнах, так і кіраўнікі міністэрстваў і канцэрнаў, якія ажыццяўляюць вытворчасць спажывецкіх тавараў. Гэта павінен быць такі механізм, які дазволіць спрасціць работу, але ў той жа час (што вельмі важна для насельніцтва), каб дакладна было зразумела, як будзе паводзіць сябе цана. Кіраўнік дзяржавы ставіць задачу, каб цана была кіраванай». Прэзідэнт паставіў яшчэ адну задачу — дапрацаваны механізм рэгулявання цэн павінен улічваць баланс інтарэсаў усіх бакоў: і вытворцаў, і пакупнікоў, і дзяржавы. Таму работа над дакументам будзе сумеснай, з удзелам урада, губернатараў, службовых асоб.

НАПЯРЭДАДНІ

«МЫ ПАВІННЫ ПАКАЗАЦЬ ГІСТОРЫЮ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ, СВАЕ ТРАДЫЦЫІ»

Беларусь прыме X Міжнародны культурна-адукацыйны форум «Дзеці Садружнасці»

Першае пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па правядзенні мерапрыемства адбылося ў Савеце Рэспублікі. Пад эгідай Міжпарламенцкай Асамблеі краін СНД па ініцыятыве Кыргызстана форум праходзіць з 2013 года. У 2021-м форум «Дзеці Садружнасці» прымала Расія, а ў 2023-м — Узбекістан. Сёлета гэта адказная місія выпала Беларусі.

«ПАМЯЦЬ — ТОЙ ФУНДАМЕНТ, ЯКІ ДАПАМАГАЕ ВЫХОЎВАЦЬ ПАТРЫЁТАЎ»

«Ужо стала добрай традыцыяй, калі праводзячы пасяджэнне Міжпарламенцкай Асамблеі, падводзім вынікі гэтага мерапрыемства, — праінфармавала **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** — Па нашай ініцыятыве, па ўзгадненні з Прэзідэнтам нашай краіны, было прынята рашэнне, што ў 2025 годзе гэты форум прыме Беларусь».

Міжнародны культурна-адукацыйны форум «Дзеці Садружнасці» пройдзе з 7 да 16 ліпеня ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня». У форуме возьмуць удзел хлопцы і дзяўчаты з 14 да 17 гадоў — па дзесяць чалавек з кожнай краіны. На бягучы момант запрашэнні паўдзельнічаць у мерапрыемстве накіраваны ў дзевяць краін.

Праграму знаходжання дзяцей на беларускай зямлі абмеркавалі падчас пасяджэння арганізацыйнага камітэта. «Мы павінны паказаць гісторыю нашай дзяржавы, свае традыцыі — усё, што сёння ёсць у Беларусі, — паставіла задачу Старшыня Савета Рэспублікі. — Праграму будзем фарміраваць так, каб хлопцам і дзяўчатам максімальна паказаць Беларусь, тыя дасягненні, якія у нас ёсць».

Тэматыка форуму — 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, памяць і адзінства пакаленняў. Невыпадкова пастаўлена задача — пазнаёміць удзельнікаў форуму з трагічнымі старонкамі гісторыі беларускага народа.

«Памяць — гэта святое, той фундамент, які дапамагае нам выхоўваць патрыётаў сваёй краіны, — патлумачыла важнасць звароту да гэтай тэматыкі Наталля Качанава. — Гэта ініцыятыва была накіравана на тое, каб дзеці з розных рэспублік былога Савецкага Саюза маглі ведаць гісторыю сваёй краіны і не толькі».

Спікер акцэнтавала ўвагу на тым, што форум добра сябе зарэкамендаваў. Дзеці з Беларусі кожны год бралі ў ім удзел. «Таму мы павінны з вамі на самым высокім узроўні падрыхтаваць і правесці гэта мерапрыемства, — рэзюмавала даручэнні спікер. — Перш за ўсё трэба, каб была цікавая праграма. У яе павінна ўвайсці наведванне такіх знакавых месцаў, як Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, мемарыяльны комплекс «Хатынь». Гэта важнае мерапрыемства мы павінны правесці вельмі годна».

«ВАЖНА ЗАХАВАЦЬ УЗРОВЕНЬ ПРОСТЫХ ЧАЛАВЕЧЫХ ЗНОСІН»

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА расказаў пра гісторыю форуму і адзначыў, што яго мэтамі з'яўляюцца патрыятычнае, маральнае, духоўнае выхаванне і аб'яднанне народаў краін, умацаванне сувязяў народаў і культур, а таксама развіццё найлепшых нацыянальных традыцый.

«Мерапрыемства павінна прайсці з улікам мэтавай устаноўкі кіраўніка нашай дзяржавы, выкладзенай у кастрычніку мінулага года на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, — падкрэсліў ён і працытаваў Прэзідэнта Беларусі: — «Нашы дзеці павінны ведаць агульныя гістарычныя дасягненні: такія як Вялікая Перамога, працоўны подзвіг пасляваеннага пакалення, першы палёт у космас і многія іншыя. У кожным поспеху — сумесны ўнёсак нашых народаў. Гэту гісторыю мы проста абавязаны перадаць з рук у рукі тым, хто прыйдзе пасля нас». Па словах кіраўніка дзяржавы, тут мала расказваць, пісаць кнігі, здымаць фільмы — важна захаваць узровень простых чалавечых зносін. Гэтай задачы і адпавядае правядзенне форуму «Дзеці Садружнасці».

Як праінфармавала па выніках пасяджэння арганізацыйнага камітэта **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Марына ІЛЬІНА**, у праграме форуму запланавана вялікая колькасць мерапрыемстваў з лідарамі меркаванняў. «Спадзяёмся, што хлопцы і дзяўчаты змогуць трапіць у будынак Савета Рэспублікі і сустрэцца з Наталляй Іванаўнай Качанавай, — дадала сенатар. — Запланавана знакавая сустрэча і з нашай беларускай касманаўткай. Магчымы сустрэчы з міністрамі. Праграма настолькі шырокая, што хлопцы і дзяўчаты змогуць пазнаёміцца як з нашай краінай, так і адно з адным. Прадугледжаны дні краін: дзеці змогуць расказаць аб сваіх нацыянальных каштоўнасцях, традыцыях».

Па словах Марыны Ільіной, стаіць няпростая задача — адабраць дзесяць чалавек з краіны для ўдзелу ў форуме. «Мы разумеем, што гэта павінны быць актыўныя хлопцы і дзяўчаты, якія любяць краіну, ведаюць і шануюць нашу гісторыю, змогуць прыехаць у свае класы, школы, гарады і расказаць аб тым, што сяброўства можа тварыць цуды», — канкрэтызавала парламентарый і выказала ўпэўненасць, што сяброўства, якое завяжацца на тэрыторыі Беларусі, стане платформай сяброўства моладзі краін і ў далейшым.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

ПРЫЯРЫТЭТЫ

РЭНТАБЕЛЬНАСЦЬ І САЦЫЯЛЬНАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ

Чысты прыбытак прамысловых прадпрыемстваў узрос у 6,4 раза

У мінулым годзе забяспечана ўстойлівая работа арганізацый сістэмы Мінпрама. Гэта падчас выніковай калегіі ведамства адзначыў намеснік прэм'ер-міністра Віктар КАРАНКЕВІЧ. «Чысты прыбытак па выніках года ўзрос у 6,4 раза, а таксама выкананы планавы паказчык па рэнтабельнасці продажаў. У экспартнай дзейнасці абнавіліся максімальныя вынікі за апошнія 10 гадоў», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Па выніках мінулага года такія паказчыкі, як выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі і рэалізацыя мерапрыемстваў па зніжэнні імпартаёмістасці прадукцыі, выкананы, падкрэсліў **міністр прамысловасці Аляксандр ЯФІМАЎ.** «Забяспечана рэнтабельная і прыбытковая работа арганізацый сістэмы міністэрства, а таксама сацыяльная стабільнасць на прадпрыемствах», — звярнуў увагу міністр. Кіраўнік Мінпрама ўпэўнены: ва ўмовах высокай канкурэнцыі на асноўных рынках і санкцыйных абмежаванняў, якія працягваюцца, — гэта дастойны вынік.

На працягу апошніх гадоў галіна штогод выконвае большасць ключавых паказчыкаў, якія даводзяцца, забяспечваючы станоўчую дынаміку аб'ёмаў вытворчасці і экспарту. З 2021 да 2024 года, нягледзячы на знешні націск з боку недружалюбных краін, Мінпрам перавышае арыенціры праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі бягучай пяцігодкі. Як адзначыў Аляксандр Яфімаў, за чатыры гады пяцігодкі тэмп росту прамысловай вытворчасці склаўся на ўзроўні 143,3 % (пры арыенціры 124,6 %), па экспарце — 168,8 % (арыенцір 136,3 %). «Сёлета плануем таксама прырастаць да рэкордных паказчыкаў мінулага года», — падкрэсліў міністр.

Летась геаграфія экспарту прадпрыемстваў сістэмы Мінпрама налічвала 67 краін свету, у тым ліку адноўлены пастаўкі на 15 рынкаў, экспарт у якія ў 2023 годзе адсутнічаў. «На сістэме Мінпрама выкананы мэтавы паказчык экспарту ў краіны далёкай дугі: тэмп росту аб'ёмаў паставак склаў 136 % да ўзроўню папярэдняга года пры заданні 120 %. Экспарт прадпрыемстваў ведамства ў краіны Афрыкі павялічыўся ў 1,5 раза, у Азію — у 1,4 раза», — адзначыў Аляксандр Яфімаў.

Для нівеліравання залежнасці ад аднаго рынку, а таксама знешніх выклікаў трэба пастаянна і планамерна займацца пераарыентацыяй экспартных паставак, упэўнены кіраўнік галіны. «У мэтах дыверсіфікацыі экспарту вызначаны краіны — апорныя пункты і перспектыўныя для супрацоўніцтва ў Азіі, Афрыцы, Лацінскай Амерыцы», — адзначыў міністр.

Гаворачы аб рабоце на рынку Расіі, Аляксандр Яфімаў нагадаў, што ў снежні 2023 года ў Мінпраме была зацверджана стратэгія развіцця і ўдасканалення работы галіновай тавараправоднай сеткі, зборачных і сумесных вытворчасцяў, сэрвісных і лагістычных цэнтраў: «З 12 запланаваных да стварэння ўжо функцыянуюць пяць адзіных мультыбрэндавых цэнтраў (у Новасібірскай вобласці, Рэспубліцы Татарстан, Кемераўскай вобласці і два цэнтры ў Омскай вобласці)». Як падкрэсліў міністр, нягледзячы на дасягнутыя вынікі, работу па стварэнні мультыбрэндавых цэнтраў трэба істотна інтэнсіфікаваць.

АКЦЭНТЫ

ВЫСОКІЯ СТАНДАРТЫ

Першае ўручэнне Знака якасці і задачы на перспектыву: калегія Дзяржстандарта падвяла вынікі і намеціла планы

У 2025 годзе ў Беларусі будуць распрацаваны 326 стандартаў (у тым ліку 130 ДАСТ) і змяненняў да дзеючых стандартаў у розных галінах эканомікі і сацыяльнага сектара — у прыватнасці ў галіне беспілотных транспартных сродкаў, лёгкай і харчовай прамысловасці.

План дзяржаўнай стандартызацыі на гэты год прадугледжвае работы па 841 тэме. Новыя стандарты і змяненні да ўжо дзеючых з'явяцца ў сферах забеспячэння адзінства вымярэнняў, будаўнічых матэрыялаў, сістэм менеджменту і г. д. Запланаваны распрацоўкі для рэалізацыі праграмы «Якасць 2021–2025», Мэт устойлівага развіцця, дзяржаўных праграм па развіцці электратранспарту, сацыяльнай абароне, у галіне тавараў і паслуг для дзяцей, у сферы турызму і забеспячэння даступнага асяроддзя. 67 ДАСТ будуць распрацаваны да тэхнічных рэгламентаў ЕАЭС, а праверка навукова-тэхнічнага ўзроўню закране 513 дзяржаўных стандартаў. Такія перспектывы былі агучаны на выніковай калегіі Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі.

Сучасныя глабальныя эканамічныя і сацыяльныя змены ставяць перад нашай краінай новыя задачы, якія не могуць быць вырашаны без новых тэхналогій, стварэння інавацыйнай эканомікі. І грамадству патрэбна сучасная нацыянальная інфраструктура якасці, якая ўключае інструменты апераджальнай стандартызацыі, забеспячэнне адзінства вымярэнняў, лічбавізацыі і сістэмнага менеджменту, адзначалася на калегіі. Неабходна стратэгія развіцця такіх кірункаў, як стандартызацыя, акрэдытацыя, ацэнка адпаведнасці, метралогія і міжнароднае супрацоўніцтва. Гэтыя кірункі знайшлі адлюстраванне ў праекце стратэгіі Дзяржстандарта да 2029 года, які распрацаваны і ў найбліжэйшы час будзе накіраваны на ўзгадненне.

ПЛАНЫ НА ПЯЦІГОДКУ

— Год якасці быў знакавым для сістэмы Дзяржстандарта, — падкрэсліла **старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Алена МАРГУНОВА.** — Мы з'яўляліся куратарамі рэспубліканскага плана па рэалізацыі ўсіх мерапрыемстваў Года якасці. Упершыню ў 2024 годзе быў зацверджаны Знак якасці. Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі праводзіў усю метадычную і кансультатыўную работу па выбары тых вытворцаў, якія ў выніку ўдастоены Знака якасці на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. Гэта 17 нашых флагманаў, і работу па праверцы дакладнасці ўсіх матэрыялаў праводзіў сакратарыят, арганізаваны на базе Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі. У рамках пяцігодкі якасці былі праведзены ўсе неабходныя падрыхтоўчыя работы, — адзначыла кіраўнік ведамства.

Стандартызацыя — падмурак выканання якасных паказчыкаў. Гэта метралагічнае забеспячэнне сістэмы Дзяржстандарта, акрэдытацыя выпрабавальных лабараторый, удасканаленне выпрабавальнай базы — усе гэтыя пытанні звязаны з ацэнкай адпаведнасці ў рамках нарматыўна-прававых дакументаў.

Наступны конкурс ужо абвешчаны, анансавала Алена Маргунова. Да 1 красавіка прадпрыемствы падаюць заяўкі на прысваенне Дзяржаўнага знака якасці ў аблвыканкамы і Мінгарвыканкам, якія праводзяць першасную ацэнку і адпраўляюць іх у сакратарыят конкурсу.

— Крытэрыі прысвоення Знака якасці ўдакладніліся, сталі больш жорсткімі і на сёння дакладна прапісаны, — падкрэсліла старшыня Дзяржстандарта.

Гаворачы пра Год і пяцігодку якасці, кіраўнік Дзяржстандарта адзначыла кірункі дзейнасці, якія складаюць аснову нацыянальнай інфраструктуры якасці. Гэта, перш за ўсё, тэхнічнае нарміраванне і стандартызацыя. У 2024 годзе праводзіліся работы па распрацоўцы змяненняў да васьмі тэхнічных рэгламентаў ЕАЭС па бяспецы ўпакоўкі, цацак, парфумерна-касметычнай прадукцыі, машын і абсталявання, маркіроўкі харчовай прадукцыі, змазачных маслаў, абмежаванні прымянення небяспечных рэчываў у электратэхніцы, энергетычнай эфектыўнасці. Два змяненні прынятыя па выніках года, астатнія пакуль — на розных стадыях распрацоўкі.

ГЕАГРАФІЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Сёлета вялікую ўвагу плануецца ўдзяліць работам у рамках ЕАЭС, адзначалася на калегіі Дзяржстандарта. У прыватнасці, выкананню Комплексу мер па рэалізацыі праграмы старшынства Рэспублікі Беларусь у ЕАЭС. Дзяржстандартам прадугледжаны шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне поўнага комплексу тэхнічных патрабаванняў да прадукцыі з задзейнічаннем Савета кіраўнікоў нацыянальных органаў па стандартызацыі дзяржаў — членаў ЕАЭС.

— У гэтай сувязі ў нас шмат планаў і ініцыятыў, — канкрэтызавала Алена Маргунова. — У першую чаргу гэта ўкараненне лічбавізацыі ва ўсе нарматыўныя дакументы, а таксама лічбавізацыя ўсіх працэсаў. Гэта апераджальная сучасная стандартызацыя прадуктаў і тавараў на іншыя рынкі, перш за ўсё далёкай дугі: вядзецца распрацоўка стандартаў, якія запатрабаваны на гэтых рынках. Гэта кірункі работы, звязаныя са штучным інтэлектам: распрацоўка стандартаў для фарміравання абароны ў пытаннях, звязаных з ШІ.

У рамках супрацоўніцтва з РФ прыняты шэраг дакументаў, мемарандумаў, дарожных карт, распавяла кіраўнік Дзяржстандарта.

— У нас будуць агульныя інфармацыйныя сістэмы, гэта важна для вытворцаў. Вядзецца распрацоўка адзіных стандартаў Саюзнай дзяржавы, — дадала яна. Пашырылася ў 2024 годзе геаграфія супрацоўніцтва Дзяржстандарта. У прыярытэце — краіны Блізкага Усходу і Азіі (Аман, Катар, Інданезія, Пакістан, В'етнам).

— З улікам нацыянальных інтарэсаў і атрымання нашай краінай статусу паўнапраўнага члена Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і краіны — партнёра БРІКС Дзяржстандарт плануе актывізаваць супрацоўніцтва з дзяржавамі, што ўваходзяць у гэтыя аб'яднанні, у мэтах стварэння ўмоў для мінімізацыі тэхнічных бар'ераў і абмену вопытам, — адзначыла Алена Маргунова. — Работы ў сферы метралогіі ўжо распачаты.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

САЦЫЯЛЬНЫ ВЕКТАР

НОВЫЯ АБ'ЕКТЫ, РОСТ ЗАРПЛАТ, ПРАГРЭСІЎНЫЯ МЕТАДЫ ЛЯЧЭННЯ

Міністэрства аховы здароўя падвяло вынікі работы

У Беларусі выросла колькасць урачоў, у дактароў і медыцынскіх сясцёр павялічваецца заработная плата, у краіне вядзецца будаўніцтва новых бальніц і паліклінік, для іх закупляецца высокатэхналагічнае абсталяванне. Па многіх кірунках, у прыватнасці анкалогіі, кардыялогіі і транспланталогіі, медыцынская дапамога ў нашай краіне адпавядае самым высокім сусветным стандартам. Пра гэта ішла размова на выніковай калегіі Міністэрства аховы здароўя.

КОЛЬКАСЦЬ МЕДЫКАЎ ВЫРАСЛА

Як адзначыў **міністр аховы здароўя Аляксандр ХАДЖАЕЎ**, мінулы год быў прысвечаны ўдасканаленню якаснай і даступнай дапамогі насельніцтву, пачынаючы ад горада і заканчваючы сялом. З'явіліся новыя нарматыўна-прававыя дакументы. Паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічная база сістэмы аховы здароўя.

— Летась мы змаглі пабудаваць і рэканструяваць 25 аб'ектаў. На гэтыя мэты з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў патрачана каля 1 мільярда 200 мільёнаў рублёў. Што датычыцца закупкі ў 2024 годзе высокатэхналагічнага абсталявання і расходнікаў да яго, даная сума складае 1 мільярд 330 мільёнаў рублёў. Хацелася б адзначыць, што лічбы ідуць са значным прафіцытам у параўнанні з 2023 годам. Гэта сведчыць аб тым, што на сённяшні дзень сістэме аховы здароўя працягвае аддавацца істотная ўвага, — расказаў Аляксандр Хаджаеў.

Ён звярнуў увагу, што работа вялася і над умацаваннем кадравага патэнцыялу.

— На сёння колькасць урачоў, якія працуюць у сістэме аховы здароўя, у параўнанні з 2023 годам павялічылася на 200 чалавек. Працуем над тым, каб наша служба, запатрабаваная насельніцтвам, заўсёды была забяспечана не толькі матэрыяльнымі, але і кадравымі рэсурсамі, — падкрэсліў міністр.

Сярод сфер, для якіх год быў прарыўным у плане новых высокатэхналагічных метадаў лячэння і складаных аперацый, Аляксандр Хаджаеў вылучыў трансплантацыю органаў, анкалогію, кардыялогію.

— Усе нашы прарыўныя тэхналогіі сканцэнтраваныя ў гэтых кірунках. Мы дасягнулі ўзроўняў, якія адпавядаюць сусветным стандартам. І нашы ўрачы працуюць над тым, каб гэтыя сусветныя стандарты былі ўкаранёны не толькі ў іх вялікіх клініках, такіх як РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава, РНПЦ «Кардыялогія», МНПЦ хірургіі, транспланталогіі, гематалогіі. Даныя стандарты павінны быць даступны на ўсіх узроўнях: там, дзе можам і павінны гэта рабіць. Таму мы працуем, каб гэтыя магчымасці прыходзілі ў абласныя цэнтры, — адзначыў міністр.

Дарэчы, вялікае будаўніцтва абласных бальніц вядзецца сёння як у Мінску, так і ў Віцебскай вобласці, Брэсце. Для іх будзе закуплена найноўшае абсталяванне, што дазволіць рэалізаваць самыя высокія сусветныя стандарты лячэння.

Сацыяльныя абавязкі перад медыкамі таксама выконваюцца.

— Кіраўнік дзяржавы неаднаразова казаў пра тое, што кожная сфера павінна быць забяспечана кадрамі. І вядома, мы разумеем, што заработная плата іграе сваю ключавую ролю. Прэзідэнт ніколі не адмаўляў нашай службе, каб зароблены грошы мы накіравалі на падтрымку тых, хто іх заслугоўвае. І ў гэтай частцы мы рэалізуем два кірункі. Цяпер мы паднялі стымулявальныя надбаўкі для ўрачоў на 45 %, а для сярэдняга медыцынскага персаналу — на 35 % на працягу года. Таму ўсе абавязацельствы, якія сёння ўзяла на сябе дзяржава, у тым ліку і па заработнай плаце нашых супрацоўнікаў, выконваюцца ў поўным аб'ёме, — падкрэсліў Аляксандр Хаджаеў

САЦЫЯЛЬНЫЯ СТАНДАРТЫ ВЫКОНВАЮЦЦА

Падчас падвядзення вынікаў міністр акцэнтаваў увагу, што дзяржаўныя сацыяльныя стандарты ў ахове здароўя выконваюцца. Нарматыў забяспечанасці ўрачамі першаснага звяна ложкамі, аптэкамі, брыгадамі хуткай медыцынскай дапамогі ў цэлым выкананы ў поўным аб'ёме ва ўсіх абласцях краіны і ў Мінску.

Па выніках мінулага года ў сістэме аховы здароўя колькасць працуючых урачоў-спецыялістаў складала 47 717 чалавек (у 2023 г. — 47 500), сярэдніх медыцынскіх работнікаў — 111 153 чалавекі (у 2023 г. — 112 207). З агульнай колькасці медыцынскіх работнікаў 11 628 (7,3 %) з'яўляюцца маладымі спецыялістамі.

Адметна, што была ўдасканалена ўступная кампанія ў медыцынскія ўніверсітэты: у 2025 годзе павялічаны набор на 424 месцы для навучання на бюджэтнай аснове. Доля мэтавага набору ў 2025 годзе складзе 80 % па ўсіх спецыяльнасцях.

Перагледжаны падыходы да размеркавання выпускнікоў медыцынскіх універсітэтаў. Так, 53,7 % выпускнікоў 2024 года размеркавана ва ўстановы аховы здароўя і аптэкі, якія абслугоўваюць сельскае насельніцтва. Найбольшая ўвага таксама аддадзена задавальненню патрэбы па найбольш дэфіцытных спецыяльнасцях (урачы агульнай практыкі, урачы-педыятры ўчастковыя, урачы хуткай дапамогі, урачы анестэзіёлагі-рэаніматолагі і ўрачы-тэрапеўты прыёмных аддзяленняў бальніц).

Захавана бюджэтнае фінансаванне аховы здароўя. Летась удзельная вага дзяржаўных расходаў на ахову здароўя склала 4,8 % ВУП. Расходы на ахову здароўя прафінансаваны за 2024 год у суме 11,79 мільярда рублёў. Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата ўрачоў склала 3186,9 рубля, сярэдніх медыцынскіх работнікаў — 1783,3 рубля.

Парк высокатэхналагічнага абсталявання на сёння складае 311 адзінак: 170 камп'ютарных тамографаў, 64 магнітна-рэзанансныя тамографы, 52 ангіёграфы і 25 лінейных паскаральнікаў.

Алена КРАВЕЦ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390
Продавец	ООО «АСБ Лизинг» (филиал «АСБ Логистик»), 202128, Минская обл., Воложинский р-н, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77. УНП 601082389
Оператор/ Адрес ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. **www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов:
легковой универсал Ford EcoSport,
рег. № 9257 РХ-7, 2017 г. в.
Местонахождение – Минская обл., Воложинский р-н, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77
Начальная цена с НДС 20 % – 35 280,00 бел. руб.
Шаг торгов – 5 % от начальной цены

Задаток 5 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 01.04.2025.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 31.03.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by

ООО «СпецРеализация»
объявляет о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ЧП «МБС-ТоргСервис»

(УНП 191778882, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Копище, ул. Лопатина, д. 7А, пом. 804).

***Дата и время проведения торгов*: 02 апреля 2025 года.**
Начало – 10.00. Заявки принимаются с 01 марта 2025 года по 01 апреля 2025 года.
Место проведения торгов: г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.
Продавец: **ЧП «МБС-ТоргСервис» (УНП 191778882), в лице председателя ликвидационной комиссии Миневич С. Г.**

№ лота	Наименование лота	Начальная цена руб., с учетом НДС по ставке 20 %	Шаг торгов	Задаток
1	Упаковочный комплекс «Инпак-Про»	72 360,00	5 %	2 %
2	Фасовочная линия в комплекте	10 836,00	5 %	2 %
3	Санпропускник дезинфекционный для людей «СПЛ-16»	1 464,00	5 %	2 %

Для участия в торгах необходимо:
1. в срок до 15.00 01 апреля 2025 года перечислить задаток по выбранному лоту в соответствии с заключенным с организатором торгов договором о задатке на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация»;
2. подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 15.00 01 апреля 2025 года заявление на участие в торгах с приложением документов в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (ред. от 12.07.2013), заключить с организатором торгов договор о задатке, заключить с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заключить с организатором торгов соглашение об оплате вознаграждения организатора торгов (соглашение о выплате аукционного сбора). Формы документов необходимо предварительно запросить у Организатора аукциона. Место приема заявлений – г. Минск, ул. Нарочанская, д. 11-2, пом. 406; время с 9.00 до 16.00 в рабочие дни. Направление документов почтовым отправлением с целью регистрации в качестве участника аукциона не допускается. Телефон для ознакомления и осмотра лота: +375296847176, Яскевич Дмитрий Васильевич в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

Заўважым, што сёння ў трэндзе адначасова два супрацьлеглыя кірункі. Першы — «ежа будучыні»: малекулярная кухня, «касмічнае» меню, інавацыі накшталт «заменніка рыбы». І другое — так бы мовіць, «ежа з мінулага». Яе прыхільнікі шукаюць фермерскія прадукты, пазнаку «арганік» на ўпакоўцы, выступаюць за адраджэнне старадаўніх рэцэптаў.

І той, і іншы запыт у Беларусі гатовы задаволіць. З аднаго боку, фарміруюцца нацыянальныя фуд-брэнды на аснове аўтэнтычных рэцэптур і мясцовай сыравіны. На гэту ідэю працуе, у прыватнасці, селекцыйная праграма па адраджэнні чырвонай беларускай каровы, малако якой адрозніваецца ад распаўсюджанай у Еўропе галштынскай пароды — у ім больш высокае ўтрыманне бялку. З іншага — распрацоўваюцца і ўкараняюцца ў вытворчасць інавацыйныя прадукты, якіх раней не было на нашым стале.

ЗАМЕСТ РЫБЫ: ГЭТАК ЖА КАРЫСНА, АЛЕ СМАЧНЕЙ

Вітаміну D у нашых шыротах арганізму не хапае, да таго ж рыба карысная для мозгу — гэта агульнавядома. Але традыцыя рэгулярнага спажывання марской рыбы па радзе аб'ектыўных прычын у краіне пакуль не склалася. Нават наш амаль нацыянальны «селядзец» — «медаль з двума бакамі»: занадта ўжо шмат там солі, а гэта наўрад ці сумяшчальна з паняццем «здаровае харчаванне». Што датычыцца свежай рыбы, то замарожаная — значна губляе ў смакавых якасцях, а незамарожаная — «б'е па кішэні». Ды і, паклаўшы руку на сэрца, мала хто з беларускіх гаспадынь умее смачна гатаваць рыбу: курыца і свініна больш прывычныя прадукты.

Навука гатовая гэта зразумець і прыняць — і распрацавала камбінаваныя збалансаваныя прадукты на аснове жывёльнай і раслінай сыравіны, якія заменяць у нашым рацыёне рыбу.

— На аснове праведзеных намі даследаванняў быў складзены нутрыентны профіль прадукту, максімальна блізкі да нутрыентнага профілю рыбы, — расказаў **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні Дзмітрый ЗАЙЧАНКА.**— У аснову прадукту заклалі курынае філе з даданнем некаторых інгрэдыентаў, такіх як курынае яйка, яечны бялок, тварог, морква, цыбуля, шпінат, мука, зялёная грэчка, гарохавы бялок, а таксама рапсавы, ільняны алей і сметанковае масла. Цяпер працуем над тым, каб вырашыць техналагічныя пытанні вытворчасці канчатковага прадукту.

Якія формы прыме «заменнік рыбы»: катлеткі, біточкі, каўбаскі, паштэт, пакуль вырашаецца. Але прадукт, безумоўна, аздаровіць меню сярэднестатыстычнай сям'і (паколькі будзе смачным і бюджэтным) і наблізіць яго да прынцыпаў правільнага харчавання, адзначаюць навукоўцы. Асабліва важная рыба ў харчаванні дзяцей, пры гэтым яна не падабаецца многім з іх, падкрэслівае Дзмітрый Зайчанка. Прадукты — аналагі рыбы валодаюць тымі ж карыснымі ўласцівасцямі, але не маюць смаку, які не ўсім дзецям даспадобы.

НЕЗЯМНЫ СМАК

«Ежа для касманаўтаў» — яшчэ адна інавацыйная распрацоўка апошніх гадоў. Гэта прадукты для ўжывання ва ўмовах бязважкасці, распавялі ў НПЦ НАН Беларусі па харчаванні. Да іх прад'яўляюцца спецыфічныя патрабаванні: забеспячэнне збалансаванага харчавання для людзей, якія працуюць у космасе, магчымасць лёгка і бяспечна захоўваць, гатаваць на бартавой кухні і ўжываць іх ва ўмовах нізкай гравітацыі. Сёння гэта ў асноўным сублімацыйныя прадукты ў вакуумнай упакоўцы, стэрылізаваныя кансервы ў алюмініевых тубах і металічных банках, а таксама ў ламістэрнай упакоўцы і ва ўпакоўках з камбінаваных матэрыялаў тыпу «паўч», тлумачыць

ІНВЕСТЫЦЫІ

Магілёўскім урачам стварылі

Новы корпус экстраннай хірургіі Магілёўскай клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, які працуе з пачатку года, — прыклад клопату дзяржавы пра здароўе нацыі. Тут створана высокатэхналагічная база для аказання неадкладнай дапамогі пацыентам з хваробамі кровазвароту — сёння гэта адна з прычын высокай смяротнасці ва ўсім свеце. У адпаведнасці з пасылам Прэзідэнта асноўнай задачай аховы здароўя лічыцца зніжэнне лятальнасці ад кіраваных прычын. І новы корпус на ўсе 100 % адпавядае гэтай мэце.

ПАМЕРАМІ З ФУТБОЛЬНАЕ ПОЛЕ

Сучасны васьміпавярховы будынак бальніцы ўражвае сваёй маштабнасцю. Для таго каб яго ўзвесці, прыйшлося ліквідаваць 12 старых будынкаў і збудаванняў бальніцы (установе болей чым 220 гадоў!) і адзін з былых карпусоў завода «Ольса». Плошча забудовы — 50 на 100 метраў — памеры, лічы, футбольнага поля. Даўжыня калідораў у новым корпусе складае каля 100 метраў. Каб аблегчыць працу медработнікаў, а таксама для павышэння аператыўнасці і хуткасці, на першых самых доўгіх чатырох паверхах выкарыстоўваюцца сродкі індывідуальнай мабільнасці — трыцыклы і скутары.

— Гэты момант мы падглядзелі ў адной з замежных універсітэцкіх клінік, — расказвае **галоўны ўрач бальніцы Павел АРЭХОЎСКІ**. — Праект унікальны для Беларусі ў першую чаргу тым, што нетыповы. Архітэктары ўлічылі ўсе нашы пажаданні. Тут сканцэнтраваны ўсе веды і ўменні, якія наш медперсанал па крупінках назапашваў, вывучаючы сусветны вопыт. Корпус цалкам зроблены пад нашы патрэбы. Для такіх бальніц, як наша, дзе акцэнт робіцца на аказанні неадкладнай медыцынскай дапамогі, галоўны фактар — гэта час. Паміж дастаўкай пацыента ў прыёмны пакой і пачаткам спецыялізаванага лячэння ён павінен быць мінімальны.

Корпус разлічаны на трыста пяцьдзясят пяць ложкаў. Першы паверх практычна цалкам прызначаны для абследавання. Зона ўмоўна падзелена на экстраную і амбулаторную. Усе аддзяленні забяспечаны палатамі інтэнсіўнай тэрапіі і ўкамплектаваны самым сучасным абсталяваннем. Гонар для бальніцы — ангіёграф ад сусветна вядомага вытворцы, які набыты па лініі Міністэрства аховы здароўя. Адзін са знакавых аб'ектаў праекта — паталагаанатамічнае аддзяленне.

— Тут у тым ліку праводзяцца даследаванні, якія ўплываюць на прыняцце рашэнняў падчас аперацыйнага ўмяшання, — заўважае суразмоўнік. — Напрыклад, аперацыя пачыналася як звычайная, але падчас яе правядзення ўзніклі падазрэнні на анкалагічную паталогію. Чалавек застаецца ў наркозе, а кавалачак яго тканкі перадаецца на тэрміновае гісталагічнае даследаванне. На працягу 10–15 хвілін прыходзіць адказ, і мы разумеем, з чым маем справу. Гэта вызначыць аб'ём аперацыі.

ДАСЛЕДАВАННІ НА ПРАЦУЮЧЫМ СЭРЦЫ

Медыцына апошнім часам вельмі імклівa развіваецца. Тэхніка становіцца ўсё больш разумная і складаная, што дазваляе рабіць даследаванні, пра якія нядаўна чалавецтва толькі марыла.

— Разам з ангіёграфам мы атрымалі першы на тэрыторыі СНД апарат унутрысасудзістай ультрагукавой дыягностыкі, — кажа Павел Арэхоўскі. — Гэта вынік прагрэсу ў сістэме аховы здароўя. Пры правядзенні кара-

вядучы спецыяліст сектара тэхналогій і нарміравання аддзела тэхналогій кансервавання Алена АРЛЯНІН.

— Напачатку «касмічнага шляху чалавецтва» было невядома, ці можа чалавек ва ўмовах бязважкасці наогул праглынуць ежу. Таму распрацоўваліся і выпускаліся пастападобныя і пюрэпадобныя гамагенізаваныя прадукты, — тлумачыць Алена Адамаўна. — З-за жорсткіх патрабаванняў, якія прад'яўляліся да рацыёну харчавання ў першых палётах, спецыялісты харчовай прамысловасці пачалі распрацоўваць мясныя кансервы і харчовыя канцэнтраты з павышаным утрыманнем сухіх рэчываў. Але касманаўтам патрэбна разнастайная ежа, набліжаная да зямной. І ў канцы 1970-х харчовая галіна прыступіла да распрацоўкі сублімаваных прадуктаў. Цяпер 60% ад усяго аб'ёму ежы, якую спажываюць касманаўты, — субліматы.

Прадукты — аналагі рыбы валодаюць тымі ж карыснымі ўласцівасцямі, але не маюць смаку, які не ўсім дзецям даспадобы.

Фактычна гэта тая ж самая ежа, якую мы ядзім дома або ў рэстаранах, з такой жа кансістэнцыяй і наборам пажыўных рэчываў, тлумачыць навуковец. Пры сублімацыі стравы гатуюцца ў звычайных умовах — гэта можа быць і першае (супы), і другое (гарніры, мяса, рыба), але без экзатычных прадуктаў і прыпраў. Пасля прадукт замарожваецца ў спецыяльным апараце. Наступны этап — ствараецца вакуум, і лёд сыходзіць, а карысныя элементы — застаюцца (сублімаваныя прадукты захоўваюць 90 % пажыўных рэчываў). Сублімацыя дазваляе знізіць масу прадуктаў. А таксама захоўваць гатовыя стравы два гады. Але калі разважаць пра перспектывы, то тэрмін захоўвання неабходна павялічыць да трох гадоў, падкрэслівае суразмоўніца.

Навуковыя цэнтры імкнуцца задаволіць запыт на перадавыя распрацоўкі ў галіне харчавання.

Прадукты павінны захоўваць зыходныя харчовыя якасці і быць бяспечнымі нават пасля працяглага захоўвання ва ўмовах нерэгуляваных станоўчых тэмператур (20–30 °С). Таму кансервы для касмічнай галіны праходзяць асаблівыя стэрылізацыйныя рэжымы, адзначыла Алена Арляніна.

— Праведзеныя спецыялістамі аддзела кансервавання НПЦ НАН Беларусі па харчаванні даследаванні па вывучэнні тэхналагічных аспектаў стварэння кансерваваных прадуктаў для касманаўтаў дазволілі распрацаваць кампанентныя склады на аснове садовай і агароднiннай сыравіны, з даданнем малочнай, мясной і зёлкавай сыравіны, — тлумачыць навуковец. — Гэтыя прадукты фізіялагічна паўнавартасныя, збалансаваныя па ўтрыманні асноўных харчовых рэчываў, валодаюць высокімі смакавымі якасцямі. Асноўнымі патрабаваннямі пры распрацоўцы кампанентных складаў сталі забеспячэнне харчовай і біялагічнай каштоўнасці (2800–3200 кКал); рэкамендаваны склад «касмічнай ежы» (12–15 % бялку, 30–35 % тлушчу, 50–55 % вугляводаў); суадносіны кальцыю і фосфару 1:1,6, кальцыю і магнію — 1:0,33; забеспячэнне арганізма касманаўта рэчывамі радыяпратэктарнай уласцівасці (пекцінавыя рэчывы і біяфлаваноіды); аказанне прафілактычнага ўздзеяння на стрававальную сістэму; павышэнне стрэсаўстойлівасці (гэтаму спрыяе выбар ежы, максімальна набліжаны па смакавых характарыстыках да хатняй).

Пакаштаваць беларускую «ежу для касманаўтаў» (супы-пюрэ з агародніны, дэсерты, мяса-раслінныя кансервы) тым, хто родную планету ніколі не пакідаў, пакуль немагчыма. Але цалкам верагодна, што неўзабаве яна паступіць у продаж і будзе даступная і для выключна зямных «едакоў».

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Ў ЗДАРОЎЕ

ўнікальныя ўмовы для аказання экстраннай дапамогі

наангіёграфіі спецыяльны датчык уводзіцца ў пашкоджаны сасуд і ўльтрагукам мераецца яго дыяметр. Гэта дае магчымасць максімальна эфектыўна ўстанавіць стэнт. Стэнт у такім выпадку будзе працаваць максімальна эфектыўна і доўга. А гэта вельмі істотна паляпшае вынікі лячэння.

Па словах галоўнага ўрача, абсталяванне бальніцы дапамагае выконваць дынамічныя даследаванні ў руху, напрыклад на працуючым сэрцы. Гэта значна паляпшае і дыягностыку, і якасць лячэння. Лапараскапічнае абсталяванне ад вядомых сусветных вытворцаў дасць магчымасць павялічыць колькасць і якасць аперацый малаінвазіўным чынам. А туліевы лазер адкрывае дадатковыя магчымасці ў лячэнні мачакаменнай хваробы, адэномы прастаты, варыкознай хваробы сасудаў ніжніх канечнасцяў, іншай паталогіі.

НЕ ТОЛЬКІ ЛЯЧЭННЕ

У жніўні мінулага года бальніца, якая мела статус гарадской, стала клінічнай. На яе базе адкрыты кафедры «Анестэзіялогія і рэанімацыя» і «Уралогія» Гомельскага медуніверсітэта. Сёлета тут збіраюцца аднавіць супрацоўніцтва з кафедрай «Акушэрства і гінекалогіі» Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта, сувязі з якай перарваліся падчас пандэміі ковіду.

— Работа ў гэтым кірунку дазваляе нам праводзіць клінічныя іспыты,— кажа Павел Арэхоўскі.

СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ

Знамянальна, што перадавы корпус бальніцы адкрыўся напачатку пяцігодкі якасці.

— Перакананы, што новыя магчымасці дазволяць нам значна павысіць якасць паслуг, — адзначае Павел Уладзіміравіч. — З такімі тэхналогіямі і абсталяваннем, якія мы атрымалі, можна істотна знізіць працягласць лячэння пацыента ў бальніцы, паменшыць колькасць часу яго рэабілітацыі. У цэлым усё гэта прынясе адчувальны эканамічны эфект краіне.

Дарэчы, пытанне маштабнага будаўніцтва доўга заставалася адкрытым, бо патрэбны былі вельмі вялікія сродкі. З мёртвага пункта ўсё зварухнулася дзякуючы былому старшыні Магілёўскага аблвыканкама Леаніду Зайцу. Менавіта ён пасля азнаямлення з умовамі работы бальніцы звярнуўся да Прэзідэнта з просьбай узгадніць будаўніцтва такога корпуса. І — атрымаў адабрэнне.

— Мы вельмі ўдзячны Леаніду Зайцу за тую падтрымку, якую ён нам аказаў, — адзначае галоўны ўрач. — У рэгіёне з'явіўся вялікі сацыяльна значны аб'ект, які будзе працаваць на карысць не толькі вобласці, але і ўсёй краіны. Сёння нашымі паслугамі карыстаюцца жыхары практычна ўсіх абласцей. Некалькі гадоў таму мы першыя ў краіне адкрылі такі комплексны від дыягностыкі, як абследаванне за адзін дзень. Чалавек загадзя ўзгадняе з нашым кантактным цэнтрам праграму абследавання і прыязджае. Ён забяспечваецца індывідуальным суправаджэннем і на працягу дня праходзіць усе цікавыя яму абследаванні. На выхадзе атрымлівае заключэнне спецыяліста і рэкамендацыі. Яшчэ адзін кірунак, які карыстаецца нязменным поспехам, — пластычная эстэтычная хірургія. За гэтымі паслугамі да нас звяртаюцца жыхары нават суседніх краін. За пазабюджэтныя грошы і сродкі спонсараў мы пабудавалі асобны будынак і цяпер маем надзейную крыніцу экспарту паслуг.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота аўтара і БелТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by
Продавец	Унитарное предприятие «АзотСпецТранс», 230013, г. Гродно, пр. Космонавтов, 100

Предмет электронных торгов: транспортные средства и спецтехника (бывшие в употреблении), расположенные по адресу г. Гродно, пр. Космонавтов, 100

Лот, №	Инв. номер	Наименование	Год выпуска	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	3000172	Полуприцеп специальный самосвал OZGUL TRAILER G, р/зн. А 5782 В-4,	2017	**46 284,00**
2	3000194	Полуприцеп специальный самосвал OZGUL TRAILER G, р/зн. А 7262 В-4	2018	**48 048,00**
3	3921	Грузовой специальный цистерна GAZ-53, р/зн. АІ 8689-4	1987	**5880,00**
4	174864	Грузовой седельный тягач MAZ 5440 19-1421-031, р/зн. АВ 8857-4	2010	**86 100,00**
5	174865	Грузовой седельный тягач MAZ 5440 19-1421-031, р/зн. АВ 8856-4	2010	**85 100,00**
6	47895	Грузовой специальный мусоровоз MAZ 533702, р/зн АІ 8473-4	2005	**10 304,00**
7	50446	Грузовой специальный самосвал MAZ 555102 220, р/зн. 8613-4	2007	**18032,00**
8	173870	Грузовой фургон тентовый MAZ 5336 А5, р/зн. АЕ 8381-4	2008	**17 584,00**
9	3000129	Грузопассажирский вагон (WAGON) GAZ-27527, р/зн. АК 1186-4	2016	**16 800,00**
10	11593	Грузовой специальный автокран IN.PROIZV KRUPP KMK 6140, р/зн. АІ 8536-4	1989	**205 044,00**
11	174110	Грузовой специальный мусоровоз MAZ 5902А2, р/зн АА 9746-4	2009	**14 392,00**

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 12.03.2025. с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **11.03.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор купли-продажи для подписания победителю аукциона

Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **от 4 % до 8 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов. Подробная информация по размеру затрат и вознаграждения опубликована на www.ipmtorgi.by в карточке предмета электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 06.02.2025 г.

Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44)-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

ОАО «МАПИД»

приглашает всех желающих принять участие в аукционе по продаже бывшего в эксплуатации и неиспользуемого оборудования.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни **с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 17.30** по адресу: **г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. 17, ОАО «МАПИД».**

Окончание приема заявлений **02.04.2025 г. в 14.00.**

Более подробная информация об аукционе по телефону **(8-017) 209-87-17.**

Аукцион состоится **02.04.2025 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, ОАО «МАПИД», каб. 303.

ЛОТ 1: пресс вибрационный М32-002
(2001 г. в., инв. № 5603).

Начальная цена – 50 923,16 руб.

УНП 100008115

ИНФОРМАЦИЯ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ в извещение о проведении аукциона, *опубликованном в газете «Звязда» от 14.02.2025*

В извещение о проведении аукциона по продаже **имущества** ОАО «Смолевичский райагросервис», опубликованном в газете, вносятся следующие изменения:

Начальную цену **лота № 3 (здание механического цеха с инв. № 614/С-26092, здание материального цеха с инв. № 614/С-31821, здание проходной с инв. № 614/С-26096, ограждение с инв. № 614/С-31825, расположенные по адресу: Минская область, Смолевичский район, Плисский с/с, п. Черницкий, а также движимое имущество)** установить с НДС (20 %) в размере **1 073 196,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – (**107 319,00** бел. руб.).

Аукцион состоится **17.03.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.03.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра 8 (029) 145-17-40.

УНН 600048461

ПАД ХВАСТОМ У КАНЯ

У Літве хочуць забараніць «збеглым» выкарыстоўваць сімвалы ВКЛ

Каторы дзень у асяроддзі збеглых стаіць несусветнае выццё адносна таго, што грамадскія дзеячы Літвы заклікалі ўлады забараніць беларусам выкарыстоўваць сімвал «Віціс» (па-нашаму «Пагоня») як на іх сувенірных пашпартах (інакш гэта непаразуменне і не назавеш), так і ў любой іншай форме ў афіцыйным кантэксце.

Гаворка ідзе пра тое, што каля 70 грамадскіх дзеячаў накіравалі адпаведны ліст прэзідэнту Наўседу, у міністэрства замежных спраў і Сейм з тым, каб спыніць спекуляванне на некалі агульнай гісторыі — з заклікам забараніць беларускай апазіцыі выкарыстоўваць сімвал «Віціс», паведамляюць літоўскія СМІ.

Сваё патрабаванне актывісты тлумачаць так: «літвінізм», што пануе ў розумах беларусаў, якія панаехалі, ва ўмовах інфармацыйнай і гібрыднай вайны працуе супраць Літвы.

Яны аргументуюць: «Мы не можам дазваліць сімвалы дзяржаўнасці і нацыянальнай ідэнтычнасці з суполкамі, значная частка сяброў якіх настроена супраць Літвы. Яны паўтараюць дэмакратычныя наратывы, якія распаўсюджвае Расія».

Аўтары ліста звяртаюць увагу на тое, што з 2020 года Літва нібыта падвяргаецца гібрыдным і інфармацыйным нападам з боку Беларусі, а за апошнія гады ў Вільнюсе пасялілася больш за 60 тысяч беларусаў, «чыю лаяльнасць практычна немагчыма праверыць».

На думку аўтараў ліста, улады павінны старанна аналіць, ці не ўспрымаюць беларусы «Віціса» як «сімвал славянскага праваслаўнага кіраўніка, які сядзеў у старажытным беларускім горадзе Вільні».

Ну, дапусцім, гібрыдным і інфармацыйным нападам Літва падвергла сама сябе, калі адкрыта падтрымала спробу дзяржаўнага пераваротy ў Беларусі і выдала на гэта «мандат» неадэкватным беларускім змагарам. Мяцеж тады пацярпеў паразу, а яго завадатары і актыўныя ўдзельнікі з усіх ног пабеглі ў бок «райскага саду», у Польшчу і Літву, якія іх чакалі «з распасцёртымі абдымкамі». Бо чакалася, што прыедуць найлепшыя пласты беларускага грамадства, высокаадукаваныя і вопытныя спецыялісты, якія і аздаровяць рынак працы той жа Літвы.

Аднак рэальнасць аказалася іншай. Прыехалі натоўпы гультаёў, махляроў і неадэкватаў, якія прывыклі сядзець на шыі ў дзяржавы, а ўсе свае хібы спісваць на дрэнную ўладу. Затое іх усіх аб'ядноўвала адна ідэя — літвінізм. Гэта калі ўсё літоўскае стала беларускім, накшталт: Вільня наша! Коўна таксама... і гэтак далей.

Разлік «дальнабачных» літоўскіх палітыкаў, што змагары зменяць свае погляды і будуць да канца стагоддзяў удзячныя Літве, пачнуць яе праслаўляць і прасоўваць, аказаўся дурной марай!

А тут яшчэ збеглыя захацелі і свой пашпарт зрабіць. Ну так, каб грашанят зарабіць. І каб расставіць усе кропкі над «і», прычапілі туды «Пагоню» і цэннік паставілі — каля 100 еўра! І хоць гэты дзіўны дакумент ніхто так і не прызнаў, але шоргату і істэрыкі ў літоўскім грамадстве ён нарабіў нямала. Так, што паляцелі ў дзяржаўныя ўстановы Літвы тоны скаргаў ад літоўскіх грамадзян, маўляў, збеглыя беларусы хочуць Літву і яе нацыянальныя сімвалы прыватызаваць.

Гісторыя з так званым пашпартам «новай Беларусі» паспела дайсці толькі да друкарні, а тая, пасля крытыкі з боку літоўскіх палітыкаў і папярэджання праваахоўных органаў краіны... спыніла іх выпуск.

Што самае пацешнае ва ўсёй гэтай гісторыі, дык гэта тое, што літоўцы і змагары сышліся ў жорсткай сутычцы: высвятляюць, у чыйго каня на гербе хвост павінен быць узняты, а ў чыйго — апушчаны. У прынцыпе, так, гэта канцэптуальная розніца. Яна тлумачыць, хто на кім паедзе.

Па выніку ўсёй гэтай гісторыі, угледзеўшы ў дзеяннях «збеглых» пагрозу нацыянальнай бяспецы, мясцовыя літоўскія актывісты звярнуліся з ініцыятывай аб забароне выкарыстання змагарамі выявы сімволікі з канём, прычым як з паднятым, так і апушчаным хвастом. Гэта каб збеглыя беларусы не ўносілі смуту ў розумы прыстойных літоўскіх грамадзян.

І змагары струхнулі, нават бар свой у цэнтры Вільні, які горда звуўся «Пагоняй», дзе абвяшчаліся гарачыя тосты за «нашу Вільню!», «Мы літвіны, яны — жмудзь» і гэтак далей, аператыўна перайменавалі ў... «Палікліліку».

А «Пагоню», мяркуючы па ўсім, давядзецца збегламу змагару схаваць у пыльную шафу, дзе шкілеты захоўваюцца. Інакш — чамадан-вакзал і пілі куды вочы глядзяць!

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1365	Весы РП-1Ш-13С, инв. № 302Т	79,20	7,92	3,96
1374	Охлодитель молока б/у, инв. № 6062	316,80	31,68	15,84
1375	Кабина б/у без док, инв. № 6063	640,20	64,02	32,01
1376	Кабина б/у без док, инв. № 6064	640,20	64,02	32,01
1377	Отопительный котел, инв. № 741; сейф, инв. № 116-О; ворохосушилка Журихи, инв. №103Т; сейф; весы; тележка; бетоносмеситель б/у; котел отопительный	568,92	56,89	28,45
1378	Компьютер ELATRON L 1734; компьютер АСТ, инв. № 1010; компьютер PHILIPS, инв. № 1044А; компьютер, инв. № 301-О; факс PANASONIC-KX-FT 98, инв. № 3056; компьютер ELATRON L 1734, инв. № 3069; компьютер 215, инв. № 5005; компьютер TOWER, инв. № 5007А; компьютер TOWER, инв. № 5008; локальные сети с компьютером, инв. № 114; многофункциональное устройство	551,76	55,18	27,59
1379	Стекло, 20 кв. м; шкив; ремень, 4 шт.; цепь зерновая, 4 шт.; пружина растяжная, 30 шт.; редуктор нижний-вальц; редуктор цилиндрич.	1 128,60	112,86	56,43
1380	Автомобиль LADA52-88AK, инв. № 19170 (без док.)	1 188,00	118,80	59,40
1381	Емкость для зерна	1 518,00	151,80	75,90
1383	Секция с дубовым фасадом, инв. № 27; секция, инв. № 268-О; письменный стол; вешалка; стеллаж офисный; стол письменный; стол угловой; стул на раме блок 2 стула, 5 шт.; стул на раме блок 3 стула, 7 шт.; тумба офисная; тумба под орг. техн.; шкаф-купе	1 354,98	135,50	67,75
1385	Сеелка СТВ, инв. № 282-О	4 356,00	435,60	217,80
1388	Почвообрабатывающий агрегат АПП 6Д б/у, инв. № 6034	25 608,00	2 560,80	1 280,40
1389	КОК - 6-2 для уборки кукурузы, инв. № 3124	18 678,00	1 867,80	933,90
1390	КЗС Журихи (силосы), инв. № 6061-ОС, 8 шт.; КЗС Журихи (карскас), инв. № 6061-ОС	12 520,20	1 252,02	626,01
1900	Комбайн КЗС-1218-10, инв. № 3124т	80784,00	8078,40	4039,20
1901	Комбайн КЗС-1218-10, инв. № 3122	80784,00	8078,40	4039,20
1902	Опрыскиватель «Мекосан» 2000-18, инв. № 3052А	14688,00	1468,80	734,40
1903	Протравитель семян ПС-20, инв. № 3113	5616,00	561,60	280,80

Лот	Наименование	Земельный участок и местонахождение	Начальная цена без учета НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
2036	Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-62162 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – здание одноквартирного жилого дома, общая площадь (протяженность) – 98,1 кв. м; составные части и принадлежности – двухэтажный кирпичный жилой дом с гаражом, четырьмя сараями, навесом, уборной	Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000110, для размещения объектов усадебной застройки (для обслуживания жилого дома), площадь – 0,1112 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Молодежная, 15	34700,00	3470,00	1735,00

В отношении лотов №№ 1365, 1374–1381, 1383, 1385, 1388–1390 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 45 %.** В отношении лотов №№ 1900–1903 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 16 (30404) от 25.01.2025, стр. 14. В отношении лота № 2036 проводятся первые торги

Местонахождение лотов №№ 1365, 1374–1381, 1383, 1385, 1388–1390: Минская область, Вилейский р-н, д. Осиповичи. **Местонахождение лотов №№ 1900, 1901:** Минская обл., Вилейский р-н, д. Шиловичи. **Местонахождение лотов №№ 1902, 1903:** Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи

Дата и время проведения торгов	В отношении лотов №№ 1365, 1374–1381, 1383, 1385, 1388–1390, 1900–1903: 14 марта 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55). В отношении лота № 2036: 3 апреля 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	В отношении лотов №№ 1365, 1374–1381, 1383, 1385, 1388–1390, 1900–1903: с 10.00 3 марта 2025 года до 16.00 12 марта 2025 года. В отношении лота № 2036: с 10.00 3 марта 2025 года до 16.00 1 апреля 2025 года

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых __.__.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1365, 1374–1378 – 10 %, по лотам №№ 1379–1381, 1383, 1385 – 9 %, по лоту № 1903 – 8 %, по лотам №№ 1388–1390, 1902, 2036 – 7 %, по лотам №№ 1900, 1901 – 6 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефону: **+375299999112, Чеслав.** Дополнительная информация по лоту № 2036 по тел. **+375293058650, Алена.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. При реализации НДС не начисляется на основании подп. 1.33 п.1 ст.118 Налогового кодекса Республики Беларусь

Информация о продавце	**ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 105, УНП 600010756)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

НАЙЛЕПШЫ ПАДАРУНАЧАК — ГЭТА ТЫ!

«Чаго хочуць жанчыны?» — пытанне, адказ на якое на наступным тыдні будуць шукаць беларускія мужчыны

8 Сакавіка — нагода парадаваць каханых жанчын падарункамі. А што менавіта падарыць дарагім і любімым — жонцы і маме, дочкам, цешчы і калегам, — паспрабуем разабрацца.

З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ СТАТЫСТЫКІ

Напярэдадні «гендарных» свят — 23 лютага і 8 Сакавіка — «Сбер Банк» правёў у Беларусі апытанне, якое паказала, у прыватнасці, што абавязковым падарункам на Міжнародны жаночы дзень 84 % апытаных лічаць кветкі. У топе таксама ювелірныя ўпрыгажэнні, касметыка і парфумерыя, бытавая тэхніка і квіткі (на канцэрт, у тэатр ці на выстаўку). Дарэчы, не першы год у лік жаданняў уваходзіць рознага роду гаджэты. Ну, а лідзіруюць сярод найлепшых падарункаў на 8 Сакавіка «проста грошы»: мінімальную суму, праўда, даследаванне не вызначае.

Мужчыны, паводле таго ж апытання, у большасці выпадкаў якраз і плануюць дарыць на 8 Сакавіка жанчынам менавіта кветкі. А таксама «ювелірку», касметыку і прысмакі (цукеркі або торт). І, так, грошы.

Падобная статыстыка, заўважым, напярэдадні Міжнароднага жаночага дня рознымі арганізацыямі збіраецца не ўпершыню. Так, з 2022 года (паводле інтэрнэт-апытання леташняга лютага) спіс найлепшых «жаночых» падарункаў практычна не змяніўся (праўда, замест «пэўнай грашовай сумы» тады ў топ-10 трапіў сертыфікат — на набыццё тавараў, у СПА або салон прыгажосці). Затое тры гады таму быў складзены рэйтынг «антыпадарункаў» — найгоршых варыянтаў таго, што можна атрымаць на 8 Сакавіка. У яго трапілі алкаголь, кухоннае начынне (каструлі-патэльні і г. д.), рознага роду сувенірныя фігуркі (свечкі, статуэткі і г. д.), мяккія цацкі.

Перадсвяточныя апытанні апошніх гадоў утрымліваюць і больш нестандартныя варыянты жаданых падарункаў. Напрыклад, у ліку найлепшых былі названы, у прыватнасці, аўтамабіль і нават хатні гадаванец (дакладней, шчанюк пэўнай пароды).

УКЛЮЧЫЦЬ ЛОГІКУ І КРЭАТЫЎ

Зрэшты, відавочна, што сапраўдны сюрпрыз апрыёры выключае паняцці «стандартны» і «сярэднестатыстычны». Гэта заўсёды нешта ўнікальнае і «адраснае». «Мімозы-патэльня-торцік», вядома, — годны адказ на «шкарпэткі-гель-душ-пену для галення» на 23-га, але калі вы хочаце сапраўды парадаваць каханую, ад стандартаў варта адмовіцца. Тым больш, што ў свята жанчынам хочацца забыцца на штодзённасць, а каструлі-патэльні якраз пра яе нагадваюць. Не лепшы варыянт і касметыка (калі толькі гэта не канкрэтная просьба жанчыны). Па-першае, мужчыны ў касметыцы звычайна не разбіраюцца. А па-другое, галоўны аргумент тут — падарунак не павінен паказваць на недахопы вашай каханай. І таму шампунь ад перхаці або крэм ад маршчын — не найлепшыя варыянты, кажуць псіхолагі.

Выбіраць падарунак варта зыходзячы з унікальнасці і непаўторнасці «адрасата». Такім чынам, каб дагадзіць з вашым дарункам, трэба шчыра цікавіцца жанчынай і ведаць пра яе захапленні. Захапляецца яна ёгай або строіць кар'еру, любіць моду або мастацтва, ходзіць у паходы або бавіць час за ўтульнай жаночай справай — напрыклад, увасабленнем у жыццё цікавых кулінарных рэцэптаў?.. У апошнім выпадку, дарэчы, забарона на «кухоннае начынне» здымаецца, але тут важны «фармат» — напрыклад, гэта можа быць дызайнерскі набор для спецыяй (бюджэтны варыянт) або агрэгат накшталт аэрагрыля або кухоннага камбайна (варыянт даражэйшы). Ведаючы аб яе перавагах, прасцей выбраць нават такі ўніверсальны, здавалася б, падарунак, як сертыфікат — у фірменны магазін пэўнага брэнда, спа-салон, на манікюр і г. д.

Падагульнім: псіхолагі раяць мужчынам пры выбары падарунка быць чулымі і ўважлівымі, уключыць логіку і праявіць крэатыў (у разумных межах, зразумела). Бо каму, як не вам, ведаць, што парадуе каханую?

І пра выдаткі «на рамантыку». У сярэднім сёлета да 8 Сакавіка на адзін падарунак мужчыны выдаткоўваюць ад 30—40 да 80—90 рублёў, распавялі ў адным са сталічных універмагаў. Сярэдняя сума ў чэку да 23 лютага ў жанчын была большай, адзначылі прадаўцы. Але не варта вінаваціць моцную палову ў скупасці. Жанчын у нашым грамадстве больш, чым мужчын, так што нават пры самых сціплых выдатках практычна кожны мужчына на падарункі жонцы, дочкам, маме, цешчы і калегам жаночага полу вымушаны выкласці досыць буйную суму.

ДАРЭЧЫ, ПРА КВЕТКІ

Кветкі, паўторымся, назвалі абавязковым падарункам на 8 Сакавіка больш за 80 % апытаных прадстаўніц прыгожага полу, але гэта зусім не палягчае мужчынам задачу. Бледная галінка ў цэлафане, падхопленая ў апошні момант на касе прадуктовага магазіна, стане падставай для крыўды, а не для радасці. Многія мужчыны лічаць, што букет на 8 Сакавіка «ўсяго толькі даніна традыцыі». Але на тое яна і традыцыя: ану паспрабуй, пакінь сваю палавінку без букета ў Міжнародны жаночы дзень! Паўнавартасны букет сёння па цане цягне на самастойны падарунак, але, зноў жа па традыцыі, кветкі (у ідэале) — толькі дадатак да падарунка асноўнага.

Сумна, але факт: з году ў год да 8 Сакавіка кветкі ўзлятаюць у цане, паведаміла прадавец аднаго з кветкавых магазінаў сталіцы. Але датычыцца гэта ў першую чаргу імпарту — замежныя аптовыя прадаўцы штогод да пачатку сакавіка павышаюць цэны працэнтаў на 15-20, адзначыла суразмоўніца. Для канчатковага пакупніка (для нас з вамі) цана на букет складаецца з кошту партыі ў аптавікоў і працэнта, які дадае крама. Дык вось, рознічная нацэнка да 8 Сакавіка не павышаецца, запэўнівае яна: крама зарабляе толькі за кошт росту продажаў.

Сёлета, зрэшты, крыху падаражэюць да свята, магчыма, і кветкі айчынныя — не ў буйных вытворцаў, а ў прыватнікаў. З 1 кастрычніка ўступіў у сілу Закон «Аб змяненні законаў па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці», згодна з якім рэалізацыя фізічнымі асобамі кветак, вырашчаных на асабістых прысядзібных участках, магчымая толькі пры наяўнасці даведкі з мясцовага выканкама аб тым, што кветкі гэты чалавек вырасціў сам. Раней такой даведкі не патрабавалася. Таксама гандляваць кветкамі могуць ІП і юрыдычныя асобы. Чакаецца, што прадаўцоў кветак да гэтага 8 Сакавіка на рынках і ў пераходах метро стане менш, а цэны пры скарачэнні прапановы, адпаведна, падрастуць. Так што, калі вам падараць шыкоўны букет, ведайце: грошай на яго не пашкадавалі. А значыць, гэта і сапраўды ад усяго сэрца!

І аб «кветкавых» перавагах. Большасць мужчын, распавяла прадавец кветак, не першы год робяць выбар на карысць цюльпанаў: яны — сучасны сімвал жаночага дня, як у савецкія гады — мімоза (яе дадаць у букеты просяць людзі старэйшага пакалення). За тыдзень да свята за цюльпанчык просяць 4 рублі, за галінку мімозы — 3—5 рублёў.

Разрыў у кошце паміж цюльпанамі і ружамі ў апошнія гады стаў менш значным, і менавіта ружы — таксама часты выбар на 8 Сакавіка. Ружы пакуль што каштуюць ад 3,90 да 4,30 за беларускую кветку. Імпартныя даражэйшыя: ад 5,70 (сярэдняга памеру, з Кеніі) да 11,50 (стройныя, з буйнымі бутонамі і на высокай ножцы, паходжанне — Эквадор). У дадзеным канкрэтным пытанні, дарэчы, дзяўчаты з мужчынамі салідарныя, сцвярджаюць прадаўцы: і цюльпаны, і ружы яны прымаюць з задавальненнем. Хоць бываюць і індывідуальныя перавагі. Напрыклад, нямала ў нас аматарак «палявых кветак» — досыць часта мужчыны пытаюцца ў кветкавых крамах пра... рамонкі. Пытанне вырашаюць рамонкавыя хрызантэмы (галінка абыходзіцца ў сярэднім у 15 рублёў).

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ИНФОРМАЦИЯ О ПЕРЕНОСЕ ДАТЫ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) сообщает об изменении даты аукциона, назначенного на 05.03.2025, по продаже по поручению **государственного учреждения «Центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций Копыльского района»** (223927, Минская область, г. Копыль, ул. Максима Горького, 31/3), проводит открытый аукцион по продаже **автомобиля легкового универсала LADA PRIORA ВАЗ-21713, 2011 г. в., рег. знак 6705 ОК-5.**
Начальная цена (без НДС) – **5 200,00** бел. руб.
Электронные торги переносятся с **05.03.2025 на 13.03.2025.**
Электронные торги состоятся 13.03.2025 в **10.00** на torgi.rlt.by.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.03.2025** до **17.00.**
Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11, (8044) 789-10-18.
Тел. для осмотра (8029) 561 15 41.
Извещение о торгах опубликовано на сайтах: minsk-region.gov.by, gki.gov.by, torgi.rlt.by.
УНП 690324015

ИНФОРМАЦИЯ О ПЕРЕНОСЕ ДАТЫ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) сообщает об изменении даты аукциона, назначенного на 05.03.2025, по продаже по поручению управления по сельскому хозяйству и продовольствию Копыльского райисполкома (223927, г. Копыль, пл. Ленина, д. 6), **легкового автомобиля седан LADA ВАЗ-21703-138-31, 2013 г. в., рег. знак 2599 KI-5.**
Начальная цена (без НДС) – **4 800,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **480,00** бел. руб.
Электронные торги переносятся с **05.03.2025 на 13.03.2025.**
Электронные торги состоятся 13.03.2025 в **10.00** на torgi.rlt.by.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.03.2025** до **17.00.**
Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11, (8044) 789-10-18.
Тел. для осмотра 37529 575 11 73.
Извещение о торгах опубликовано на сайтах: minsk-region.gov.by, gki.gov.by, torgi.rlt.by.
УНП 690324015

ИНФОРМАЦИЯ О ПЕРЕНОСЕ ДАТЫ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) сообщает об изменении даты аукциона, назначенного на 03.03.2025, по продаже по поручению ГУ «Стародорожский районный центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций» (222932, г. Старые Дороги, ул. Пролетарская, д. 38):
Лот № 1: автобус MAZ 241000, 2013 г. в., рег. знак АН 3279-5.
Начальная цена (без НДС) – **9 633,40** бел. руб.
Лот № 2: автобус MAZ 241S00, 2014 г. в., рег. знак АО 2470-5.
Начальная цена (без НДС) – **10 766,60** бел. руб.
Электронные торги переносятся с **03.03.2025 на 11.03.2025.**
Электронные торги состоятся 11.03.2025 в **10.00** на torgi.rlt.by.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.03.2025** до **17.00.**
Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11, (8044) 789-10-18.
Тел. для осмотра (8029) 396-55-40.
Извещение о торгах опубликовано на сайтах: minsk-region.gov.by, gki.gov.by, torgi.rlt.by.
УНП 690324015

ИНФОРМАЦИЯ О ПЕРЕНОСЕ ДАТЫ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) сообщает об изменении даты аукциона по продаже по поручению государственного предприятия «Детский реабилитационно-оздоровительный центр «Ждановичи» **легкового автомобиля Skoda Octavia, 2004 г. в., рег. знак 5015 AI-5.**
Начальная цена с НДС (20 %) – **4 011,02** бел. руб.
Электронные торги переносятся с **03.03.2025 на 12.03.2025. Электронные торги состоятся 12.03.2025** в **10.00** на torgi.rlt.by. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.03.2025** до **17.00.**
Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11, (8044) 789-10-18. Тел. для осмотра (8029) 396-55-40.
Извещение о торгах опубликовано на сайтах: minsk-region.gov.by, gki.gov.by, torgi.rlt.by.
УНП 690324015

ИНФОРМАЦИЯ О ПЕРЕНОСЕ ДАТЫ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) сообщает об изменении даты аукциона, назначенного на 07.03.2025 по продаже по поручению **государственного учреждения «Клецкий районный центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций»** (222531, Минская область, г. Клецк, пл. Маяковского, 10) **автомобиля легкового внедорожника универсального HYUNDAI SANTA FE, 2011 г. в., рег. знак 9526 OP-5.**
Начальная цена (без НДС) – **12 950,00** бел. руб.
Электронные торги переносятся с **07.03.2025 на 14.03.2025. Электронные торги состоятся 14.03.2025** в **10.00** на torgi.rlt.by. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.03.2025** до **17.00.**
Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136-31-11, (8044) 789-10-18. Тел. для осмотра 37529 561 15 41.
Извещение о торгах опубликовано на сайтах: minsk-region.gov.by, gki.gov.by, torgi.rlt.by.
УНП 690324015

ГУЛЬНЯ ЗА РЭСУРСЫ

Еўропа прайграла сутычку за ўкраінскія нетры

Імклівымі геапалітычнымі ўзрушэннямі запомніўся люты гэтага года. Спачатку тэлефонная размова Дональда Трампа і Уладзіміра Пуціна, затым сустрэча дэлегацый Расійскай Федэрацыі і ЗША ў Саудаўскай Аравіі і напрыканцы рахунак за фінансавую дапамогу і патрабаванні доступу да ўсіх прыродных рэсурсаў, які выставіў Трамп Украіне. Усё гэта паасобку і разам выклікала сапраўдны шок і прыступы істэрычнай панікі ў заходняй палітычнай эліты. З чым жа звязаная такая неадэкватная рэакцыя Захаду і якія мэты пераследуюць на самай справе еўрапейцы і амерыканцы?

ПАКАЗАЦЬ ВЫНІК ЗА ПЕРШЫЯ 100 ДЗЁН

Адразу варта ўдакладніць, што Трамп далёка не такі альтруіст-міратворац, як можа здацца. Ім кіруюць куды больш сур'ёзныя і прагматычныя мэты.

Па-першае, яго дзеянні прадыктаваныя падрыхтоўкай да прамежкавых выбараў у Кангрэс, якія пройдуць ужо ў лістападзе 2026 года. Па амерыканскіх законах гэтыя выбары праводзяцца ў сярэдзіне чатырохгадовага тэрміну паўнамоцтваў прэзідэнта. Таму, калі Трамп не выканае свае абяцанні, у прыватнасці завяршыць канфлікт ва Украіне на працягу года і аздаравіць амерыканскую эканоміку, то пад ударам апынецца не толькі ён, але і ўсе рэспубліканцы, што можа прывесці іх да страты кантролю адразу над дзвюма палатамі парламента. І для такога сцэнарыя ёсць усе падставы, бо, паводле статыстыкі, партыя прэзідэнта вельмі часта губляе месцы ў Палаце прадстаўнікоў і Сенаце ў выніку такіх прамежкавых выбараў.

Да таго ж значнай датай у амерыканскай палітыцы выступаюць першыя 100 дзён прэзідэнцтва. Ужо цяпер дэмакраты, якія прайгралі па ўсіх франтах з іх ліберальнай тэматыкай і падначаленымі ім CMI, збіраюць кампрамат на Трампа і рыхтуюць «інфармацыйны ўдар» па выніках першых ста дзён яго кіравання. Ратуе яго пакуль тое, што ў дэмакратаў няма такога харызматычнага і папулярнага партыйнага лідара, які змог бы цягацца з рэспубліканцам.

УЗЯЦЬ З «НЕЗАЛЕЖНАЙ» УСЁ, ШТО МОЖА ДАСТАЦЦА ЕЎРАПЕЙЦАМ

Па-другое, нарастальнае супрацьстаянне з Кітаем змушае ЗША шукаць дадатковыя крыніцы атрымання розных рэдказямельных металаў. Гэта група з 17 хімічных элементаў, якія адыгрываюць ключавую ролю ў сучасных тэхналогіях: электроніцы, вытворчасці магнітаў і высокадакладных прыбораў, аэракасмічнай, аўтамабільнай, ваеннай і хімічнай галінах.

Асноўным сусветным пастаўшчыком гэтых выкапняў сёння з'яўляецца Кітай — да 70 % ад агульнага аб'ёму вытворчасці. Таму ў ходзе маючага адбыцца эканамічнага супрацьстаяння Паднябесная цалкам можа перакрыць для ЗША паток гэтых рэсурсаў. Што будзе ў такім выпадку з амерыканскай эканомікай і яе асобнымі галінамі, застаецца толькі здагадвацца. Такім чынам, зразумела, чаму Трамп удзяляе настолькі вялікую ўвагу гэтаму пытанню.

Што датычыцца Украіны і яе запасаў рэдказямельных металаў, то яна нават не ўваходзіць у першую дваццатку краін, а ўлічваючы, што Расія кантралюе значныя тэрыторыі Данбаса, дзе адзначаюцца запасы гэтых запатрабаваных выкапняў, то месца Украіны яшчэ ніжэй. Хутчэй за ўсё Трамп вырашыў узяць з «Незалежнай» усё, што можа дастацца... еўрапейцам. І такім чынам аслабіць свайго эканамічнага канкурэнта. Паколькі не сакрэт, што менавіта вядучыя краіны Еўрасаюза прэтэндавалі на нетры Украіны і нават падпісалі з ёй у 2021 годзе мемарандум аб узаемаразуменні.

Паводле гэтага дакумента, Еўрасаюз забяспечваўся «крытычна важнымі прыроднымі рэсурсамі» ўкраінскага паходжання. Хоць тады Еўракамісія вуснамі свайго прадстаўніка Тома Рэнье і заявіла, што «гаворка ідзе аб супрацоўніцтве з Украінай, а не аб уступленні ў канкурэнцыю», ніякіх канкрэтных дамоўленасцей дасягнута не было. Ды і ўвогуле, як паведамляе Politico, Еўрапейскі саюз не ўзгадняў з Украінай ніякіх канкрэтных крокаў, якія б дазволілі ЗША ўзяць пад кантроль украінскія нетры.

Такім чынам, Трамп, які ўжо ўзяў пад кантроль украінскую ўласнасць, можа ўзяць пад кантроль і нетры, а Еўропа, якая ўжо ўклала ў Украіну 200 мільярдаў еўра, можа развітацца з грашыма, якія ўжо ніколі не вернуцца.

Такім чынам, Трамп, які ўжо ўзяў пад кантроль украінскую ўласнасць, можа ўзяць пад кантроль і нетры, а Еўропа, якая ўжо ўклала ў Украіну 200 мільярдаў еўра, можа развітацца з грашыма, якія ўжо ніколі не вернуцца.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2025.Б.002.00053

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов», УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

Лот № 1. Кап. строение с инв. № 500/С-34433 площадью 564,1 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/23, наименование: здание АБК реконструкции приемного отделения, назначение: здание неустановленного назначения. Составные части и принадлежности: Литер А3/к-здание АБК реконструкции приемного отделения.
Объект расположен на зем. участке с кадастровым № 500000000006004362 по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/13 (общее долевое право постоянного пользования).

Начальная цена: 600 000,00 бел. руб. без НДС.
Минимальная цена: 480 000,00 бел. руб. без НДС.

Дополнительное условие по лоту № 1: Покупатель обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи на приобретение движимого имущества на общую сумму 14277,00 бел. руб. без НДС и возместить расходы на проведение независимой оценки в размере 172,80 бел. руб. без НДС: отстойник для сточных вод (материалы) 400509 – 1 шт., И-проволка Ф1.0 ММ низкоуглеродист. – 61,8 кг, окна из ПВХ со стеклопакетами б/у – 1 шт., п/цилиндр ППУ-159*50 – 4 п. м, п/цилиндр ППУ-219*50 – 36 п. м, тройник – пи 108Х4-2000/89Х3,5 РБ – 7 шт., элемент нестанд. отделки панелей – 21 шт., элемент отделки панелей – 148,3 кв. м, анализатор паров алкоголя, инв. № 501430 – 1 шт., анализатор паров алкоголя, инв. № 501423 – 1 шт., вывеска «Бетон» 650х2100, инв. № 501643 – 1 шт, вывеска магазина, инв. № 501417 – 1 шт., выпрямитель сварочный ВД-501У3, инв. № 500810 – 1 шт., компьютер, инв. № 400262 – 1 шт., конвейер № 1 на линию дробления, инв. № 276 – 1 шт., конвейер № 2 линии дробления, инв. № 277 – 1 шт., конвейер № 3 возврата линии дробления, инв. № 279 – 1 шт., паромер КП-133 для определения содержания воздуха в бетонной смеси, инв. № 501600 – 1 шт., устройство для затарки теннис. с прием. бункером на линию дробления, инв. № 500571 – 1 шт., шкаф ШР-21, инв. № 400202 – 1 шт., ограждение металлическое, инв. № 500590 – 1 шт., питатель пластинчатый для линии дробления, инв. № 280 – 1 шт.

Условия электронных торгов: Победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для их проведения, расходы на проведение независимой оценки с оплатой услуг оператора ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов и заключить договор купли-продажи движимого имущества в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить стоимость приобретенного имущества не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договоров купли-продажи. Расходы на проведение независимой оценки – 1987,20 бел. руб. без НДС.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.
Имеющиеся обременения: нет.

Дата и время начала и завершения электронных торгов: 02.04.2025 с 9.00 до 16.00.

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by/.

Прием документов осуществляется на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by по **16.00 01.04.2025.**

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 16.00 01.04.2025.**

Задаток по лоту № 1 в сумме **60 000,00** (шестьдесят тысяч рублей 00 копеек) бел. руб. должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, код операции 40901.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Справочная информация

Контактный телефон антикризисного управляющего +375 (17) 360-24-99.
Контактный телефон для осмотра объектов +375 44 7936323.
Контактные телефоны лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.
Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по месту нахождения имущества.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат, затраты на обслуживание ЭТП определяются согласно прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на **http://etpvit.by** до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

Лот № 1. Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом (фундамент – железобетон, площадь застройки – 82 кв. м, процент готовности – 12 %) по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Городнянский Мох, ул. Центральная, 2А и земельный участок с кадастровым № 221287004601000079 площадью 0,1500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Городнянский Мох, ул. Центральная, 2А.

Начальная цена предмета аукциона (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): **7519,26** (4879,26/2640,00) бел. руб.

Задаток: 751,92 бел. руб.

Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 64,89 %.

Реквизиты для внесения задатка по лоту № 1: р/с: BY87 AKBB 3604 3141 0001 5200 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300977139, код операции 40901. Получатель платежа: Новкинский сельисполком.

Дата, время и место проведения аукциона: 03.04.2025 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 03.03.2025 до 17.30 02.04.2025.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия аукциона: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся в организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта, разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на зем. участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87, выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством.

Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.

Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность.

Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона.

Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона.

Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

рэнцыю, у прыватнасці са Злучанымі Штатамі», але ў Вашынгтоне ўсё выдатна зразумелі і вырашылі перакрыць кісларод еўрапейскім канкурэнтам. І з падпісаннем цяперашняга амерыкана-ўкраінскага дакумента, па якім практычна ўсе карысныя выкапні Украіны будуць належаць ЗША, выдатна з гэтым справіліся.

У перспектыве амерыканцы і далей будуць аслабляць Еўропу як у эканамічным, так і ў палітычным плане. Усё гэта дазволіць Трампу рэалізаваць свае мары: прыбраць да рук багатую на карысныя выкапні, у тым ліку і на рэдказямельныя металы Грэнландыю.

А вось ва ўзаемаадносінах з Расійскай Федэрацыяй па пытанні доступу да карысных выкапняў у Злучаных Штатаў абсалютна іншы падыход. Тут адыгрываюць ролю дзве акалічнасці.

Першая з іх — Расія зусім не марыянетачная Украіна ці васальная Еўропа, а звышдзяржава з сучаснай арміяй, ядзернай зброяй і магутным ваенна-прамысловым комплексам.

Другая акалічнасць — на расійскай тэрыторыі знаходзяцца найвелізарнейшыя запасы карысных выкапняў. Па тых жа рэдказямельных металах, напрыклад, Расія займае чацвёртае месца ў свеце.

У сваю чаргу, і Масква зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Вашынгтонам. І тут асноўная прычына крыецца ў неабходнасці прыцягнення інвестыцый і тэхналогій для здабычы і апрацоўкі рэдказямельных металаў. Невыпадкова Уладзімір Пуцін заявіў, што Расійская Федэрацыя гатовая працаваць з амерыканцамі па рэдказямельных металах, у тым ліку на новых тэрыторыях. І гэтую заяву расійскага лідара заўважылі за акіянам.

Выступаючы на брыфінгу на youtube-канале Белага дома Трамп падкрэсліў, што «хацеў бы купляць мінералы на расійскай зямлі, бо Расія валодае велізарным запасам рэдказямельных металаў і іншымі каштоўнымі рэсурсамі».

РЭКОРДНЫ ЗНЕШНІ ДОЎГ ВЫМУШАЕ РУХАЦЦА ХУТЧЭЙ

І па-трэцяе, чаму ЗША так паскараюць працэс перагавораў? Гэта досыць складаная эканамічная сітуацыя, у якую Злучаныя Штаты трапілі дзякуючы кіраванню дэмакратаў з іх павальным крадзяжом і бескантрольнымі выдаткамі бюджэтных сродкаў. Усё гэта прывяло да таго, што столь знешняга доўгу дасягнуў фантастычнай лічбы ў 36 трыльёнаў долараў, або звыш 123 % усяго ВУП краіны!

Характэрна, што выдаткі ўрада значна перавышаюць даходы, якія атрымлівае бюджэт ужо вось на працягу 23 гадоў. Апошні раз прафіцыт бюджэту ЗША адзначаўся ў 2001 годзе. Таму Вашынгтону даводзіцца браць у доўг яшчэ і яшчэ, усё больш і больш, каб папоўніць казну і закрыць бюджэтны дэфіцыт. І хоць наяўнасць дзярждоўгу, няхай і ў такім вялікім дачыненні да ВУП, і не кажа аб неадкладным эканамічным краху краіны, аднак працэнтныя плацяжы па дзяржаблігацыях вымушаюць Трампа шукаць магчымасці папаўнення бюджэту. Менавіта таму амерыканскі лідар практычна адразу пасля інаўгурацыі запатрабаваў ад Украіны вяртання выдзеленых сродкаў, прычым яшчэ з працэнтамі. Гэта значыць, за кожны долар дапамогі, выдзелены Кіеву, ён хоча атрымаць два!

Акрамя таго, для змены гандлёвага дысбалансу Трамп мае намер увесці гандлёвыя пошліны супраць Канады, Кітая і Еўрасаюза, прычым вельмі немалыя.

Што датычыцца палітычнага істэблішменту Еўрасаюза, Паўночнай Еўропы і Вялікабрытаніі, асабліва яго найбольш ашалелай русафобскай часткі, то для яго крокі Трампа смерці падобныя. І ў першую чаргу гэта датычыцца магчымай агалоскі аб фінансавых махінацыях еўрапейскіх эліт, аб створаных імі крымінальных схемах па адмываніі грошай — як амерыканскіх, так і непасрэдна саміх еўрапейскіх падаткаплацельшчыкаў. Бюракраты па ўсёй Еўропе баяцца, што можа з'явіцца аналаг амерыканскага Дэпартамента эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання ЗША (DOGE) і выявяцца такія факты крадзяжу і махлярства, што ўвесь свет проста ахне. Маштабы еўрапейскай карупцыі, асабліва брусельскіх чыноўнікаў, могуць аказацца такімі, што памеркнуць нават апошнія расследаванні DOGE. А гэта ўсё ставіць пад удар палітычную будучыню кіраўніцтва пераважнай большасці краін Еўропы.

Ужо цяпер пачынаюць усплываць вельмі непрывабныя факты. У прыватнасці, Еўрапейскае бюро па барацьбе з махлярствам (OLAF) запатрабавала ад Польшчы вярнуць украдзены 91 мільён еўра, прызначаны для набыцця і дастаўкі электрагенератараў на Украіну.

Акрамя таго, як піша польскае выданне Onet, «звязаныя з польскай партыяй «Права і справядлівасць» (PiS) асобы падазраюцца ў незаконным прысваенні сродкаў, выдаткаваных на антырасійскую кампанію». Паводле звестак выдання, было ўкрадзена каля 6 мільёнаў долараў, выдаткаваных канцылярыяй прэм'ер-міністра Польшчы на кампанію StopRussiaNow. Гэтыя грошы трапілі ў кішэні «залатых хлопчыкаў — бізнесоўцаў і сяброў прадстаўнікоў польскага кіраўніцтва»...

Таксама ў Еўрасаюзе выдатна разумеюць, што Трамп будзе актыўна дзейнічаць супраць еўрапейскіх эліт для іх замены на сваіх ідэйных паплечнікаў — правых кансерватараў. А еўрапейскія грамадзяне з-за эканамічных і сацыяльных праблем, гвалтоўнага ўкаранення ліберальнага парадку дня ўжо даведзены да такога стану, што правыя кансерватары непазбежна будуць набіраць вагу і ў выніку апынуцца ва ўладзе ў многіх краінах. Дастаткова ўспомніць апошнія выбары ў нямецкі Бундэстаг, дзе «альтэрнатыва для Германіі», якую ўлады палівалі ўсялякімі памыямі і называлі то «прафашысцкай», то «прарасійскай», заняла другое месца на выбарах у парламент, паказаўшы самы маштабны прырост выбаршчыкаў. Для Бруселя такі расклад, як страшны сон, таму што правыя вельмі скептычна ставяцца да Еўрасаюза.

Што датычыцца непасрэдна падпісання дагавора паміж ЗША і Украінай, па якім Вашынгтон атрымае практычна непадзельны доступ да ўкраінскіх прыродных рэсурсаў, то тут выразна прасочваецца палітычны і эканамічны пройгрыш Еўрасаюза, які імкнуўся забяспечыць сабе танныя пастаўкі крытычна важнай сыравіны (напрыклад, такой як літый), каб не толькі паменшыць сваю залежнасць ад кітайскіх пастаўшчыкоў, але і знізіць залежнасць ад выкапнёвага паліва.

Аднак дзеянні Трампа практычна цалкам пазбавілі Еўрасаюз доступу да запасаў рэдкіх і рэдказямельных металаў на тэрыторыі Украіны. Нават слёзныя галашэнні міністра абароны Францыі Лекарню аб тым, што французская сістэма абароны мае патрэбу ў рэсурсах, якія неабходныя для сістэмы ўзбраенняў, не толькі на найбліжэйшыя гады, але і на 30—40 гадоў наперад, а таксама вернападданніцкія візіты ў Вашынгтон Макрона і Стармера не дапамаглі Еўропе дамагчыся саступак у Трампа.

Сяргей ЧЫЧЫЛАЎ.

«УРАДЖАЙНАЕ ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ»

Правілы правядзення рэкламнай гульні

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Ураджайнае лета — з любімай газетай» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі тэрмінам з 1 сакавіка 2025 года да 30 чэрвеня 2025 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» і газету «Літаратура і мастацтва» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2025 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Ураджайнае лета — з любімай газетай» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ, руб. кап.	Усяго з ПДВ, руб. кап.
1	Цяпліца Green Apple GA-House-3x-frame/ B0063899 (далей — суперпрыз)	1	203,74	203,74
2	Парнік «Вастраў камфорту» «Бабулін парнічок» 8 м (48146920001780)	7	33,311	233,18

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Ураджайнае лета — з любімай газетай» складае: 436,92 (чатырыста трыццаць шэсць) рублёў дзвюноста дзве капейкі.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Ураджайнае лета — з любімай газетай» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» і газету «Літаратура і мастацтва» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2025 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на другі квартал або першае паўгоддзе 2025 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 сакавіка 2025 года да 18 красавіка 2025 года выразаная з газеты або з дададковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка газеты «Звязда» або газеты «Літаратура і мастацтва», якая змяшчаецца ў газеце «Звязда» і газеце «Літаратура і мастацтва» не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 сакавіка 2025 года да 18 красавіка 2025 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ва Установу пасля 24 красавіка 2025 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

9. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца 25 красавіка 2025 года ў 12.00 у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

10. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

11. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываецца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

12. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні арганізатар Гульні. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваецца арганізатар Гульні.

13. Вынікі розыгрышу публікуюцца да 2 мая 2025 года ўключна ў газеце «Звязда» і газеце «Літаратура і мастацтва».

Установа ў тэрмін да 2 мая 2025 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

V. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

14. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2025 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2025 года.

15. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» або газету «Літаратура і мастацтва» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2025 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

16. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 чэрвеня 2025 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам Гульні па тэлефонах: (017) 271-12-94, 311-17-40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, Установа не аплачвае.

17. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

18. Пасля 30 чэрвеня 2025 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VI. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

19. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

20. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

21. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Ураджайнае лета — з любімай газетай» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» і газеце «Літаратура і мастацтва».

22. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 271 12 94, 311 17 40.

Информация о проведении аукциона 31 марта 2025 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Гончаровка, д. Черниковщина Заболотского сельсовета Смолевичского района Минской области.

Организатор аукциона: Заболотский сельский исполнительный комитет, 222223, аг. Заболотье, ул. Купрейчика, 1а

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)
1	дер. Гончаровка, ул. Луговая, 2А (объект № 23/2023)	624882001601000423	0,1813	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	35 000
2	д. Черниковщина (объект № 68/2021)	624882007101000442	0,144	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	20 000

Аукцион состоится 31 марта 2025 г. в 14.00 в Заболотском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Заболотье, ул. Купрейчика, 1а, зал заседаний.

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by,** Смолевичского райисполкома: **http://www.smolevichi.gov.by.**

УНП 600023902

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На гэтым тыдні вам проста неабходна выявіць альтруізм, здзейсніўшы які-небудзь у меру бескарыслівы ўчынак. Гэта, прынамсі, дазволіць адчуць сябе важным і патрэбным. Цяпер не варта ладзіць ніякіх сур'ёзных спрэчак, ды і праектаў.

ЦЯЛЕЦ. Ад вашага настрою і энергіі будзе залежаць паспяховая рэалізацыя доўгатэрміновых планаў. У першай палове тыдня падзеі будуць працякаць паспяхова практычна ва ўсіх абласцях вашай дзейнасці. А вось бліжэй да выхадных з'явяцца складанасці і напружанне.

БЛІЗНЯТЫ. Вы можаце паспяхова справіцца з самымі складанымі задачамі, якія раней уяўляліся невырашальнымі. Пажадана знізіць аб'ём працы, больш адпачываць, гуляць, хадзіць на спатканні. Не хавайце свае пачуцці ад блізкіх людзей, яны з разуменнем паставяцца да вас, а іх падтрымка падбадзёрыць і надасць сілы.

РАК. На гэтым тыдні ў любой сітуацыі не губляйце галавы, кантралюйце эмоцыі. Менавіта цяпер вы здольныя шмат чаго змяніць, прычым ад вас не спатрэбіцца ніякіх звышнамаганняў, а ад завершанасці ў справах адчуеце задавальненне. Аўторак і серада — амаль ідэальныя дні для таго, каб спакойна, без спешкі заняцца руцінай. Асабліва цікавыя ідэі могуць наведаць вас у пятніцу.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні паспрабуйце выправіць назапашаныя памылкі і недакладнасці, згладзіць дробныя шурпатасці ў адносінах і выцерці пыл на асабліва бачных месцах. Вялікія справы паспееце зрабіць пазней, пакуль час малога, але неабходнага. Звярніце ўвагу на вашы адносіны з партнёрамі, можа быць, не ўсе з іх добрасумленныя. Субота можа аказацца днём нечаканых сустрэч і незапланаваных паездак.

ДЗЕВА. На гэтым тыдні ў вас з'явіцца магчымасць адкрыць новыя прасторы для сваёй дзейнасці, сябры будуць гэтаму спрыяць. У справах выявіце дыпламатычнасць і гнуткасць, прыслухайцеся да голасу інтуіцыі. У сярэдзіне тыдня давядзецца прымаць сур'ёзнае рашэнне, ад якога могуць залежаць далейшыя падзеі ў асабістым жыцці.

ШАЛІ. Неабходна разумна падысці да ацэнкі сітуацыі, якая склалася, эмоцыі будуць толькі перашкаджаць вам. Планы на рабоце могуць мяняцца, але не палохайцеся, вы бліскуча справіцеся з новымі задачамі. Накіруйце сваю энергію на вырашэнне самага актуальнага ў гэты момант. У выхадныя паспрабуйце не перашчыраваць са спатканнямі, вечарынамі і забаўкамі.

СКАРПІЁН. Вы лёгкія на ўздым, рашучыя, энергічныя, і гэтыя якасці з'яўляюцца залогам поспеху. Самы час заняцца ажыццяўленнем задуманага. Ад гэтага палепшыцца настрой, узрастуць вашы шанцы на поспех. Выкарыстоўвайце праверэныя метады для дасягнення мэт.

СТРАЛЕЦ. У пачатку тыдня не выключаны рэзкія перапады настрою, хоць асабліва прычын для гэтага не прадбачыцца. Імкніцеся завяршаць пачатыя справы. Застаўшыся недаробленымі, яны паграбаюць павіснуць мёртвым грузам надоўга. У аўторак не вельмі давярайце парадам добразычліўцаў, больш спадзявайцеся на сябе.

КАЗЯРОГ. З'явіцца магчымасць праявіць сябе ў новай справе, што можа прынесці дадатковы прыбытак. У аўторак пазбягайце людных месцаў, у вас наўрад ці атрымаецца бліскуча выступіць на сцэне ці на працоўнай нарадзе. А вось у чацвер свае ідэі і прапановы вы зможаце абараніць перад начальствам. У выхадныя арганізуйце сабе культурную праграму.

ВАДАЛІЙ. На гэтым тыдні непажадана праяўляць актыўнасць і ініцыятыву. Многія праблемы вырашацца без вашага ўдзелу, займіце чакальную пазіцыю. У адносінах з навакольнымі важныя вытрымка і спакой, паспрабуйце не казаць лішняга, не прыдзірайцеся да чужых недахопаў і не лезьце з парадамі, калі вас аб гэтым не просяць. У суботу чакайце гасцей.

РЫБЫ. Старайцеся трымацца далей ад прывабна-казачных авантур як у каханні, так і на рабоце. Магчымыя прыліў сіл, імкненне да змены месцаў. Справы могуць ісці з пераменным поспехам, таму неабходныя ўважлівасць і добрасумленнасць. Своеасаблівыя адносіны з роднымі будуць вымушаць жадаць лепшага, і вам, верагодна, прыйдзецца саступіць. Адмысловую ўвагу надасце сям'і і дому.

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

1 САКАВІКА Даты Падзеі Людзі

У краіне

1566 год — уступіў у дзеянне Другі Статут Вялікага Княства Літоўскага — звод законаў феадальнага права Вялікага Княства Літоўскага, помнік беларускай пісьменнасці, мовы і юрыдычнай думкі. Дзейнічаў на землях Вялікага Княства Літоўскага ў 1566—1588 гадах. Асноўныя крыніцы: агульназемскія і рэгіянальныя прывілеі, Судзебнік Казіміра, Першы Статут і некаторыя нормы звычаёвага права, таксама выкарыстоўваліся нормы царкоўнага (рыма-каталіцкага і грэка-праваслаўнага) права.

1918 год — у Маскве выйшаў першы нумар беларускай газеты «Дзянніца», якая стала першай савецкай газетай на беларускай мове. «Дзянніца» ўпершыню выйшла ў Петраградзе ў 1916 годзе, дзе існавала беларуская суполка бежанцаў з акупіраванай кайзераўскай Германіяй тэрыторыі Беларусі. Выдавалася на ўласныя сродкі Зміцера Жылуновіча. Выходзіла з кастрычніка да снежня 1916-га.

1926 год — нарадзіўся (в. Хутар Быхаўскага раёна) Барыс Васільевіч Стральцоў, беларускі пісьменнік і публіцыст. Адзін з заснавальнікаў навуковай школы беларускай журналістыкі і «кароль» беларускага нарысу. Кандыдат гістарычных навук, доктар філалагічных навук, прафесар. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь. Былы супрацоўнік газет «Чырвоная змена» і «Звязда».

У свеце

1564 год — кнігавыдавец і асветнік Іван Фёдараў надрукаваў першую ў Маскоўскай дзяржаве датаваную кнігу — «Апостал».

1692 год — у Салеме (штат Масачусетс) улады абвінавацілі трох жанчын у вядзьмарстве. У наступныя месяцы больш за 150 жанчын і мужчын былі кінуты ў турму па аналагічных абвінавачаннях, 19 з іх пакараныя — пачатак «палявання на салемскіх ведзьмаў».

1863 год — нарадзіўся Фёдар Салагуб, рускі паэт, пісьменнік, драматург, публіцыст, перакладчык. Адзін з галоўных прадстаўнікоў рускага літаратурнага дэкадэнцтва, рускага сімвалізму.

АЛЁНАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

ТРЭ БЫЛО СЛУХАЦЬ ЖОНКУ

Некалі раней гаспадаром у хаце лічыўся муж, мужчына. Ён зарабляў грошы, ён жа іх размяркоўваў. Жонка, жанчына займалася выхаваннем дзяцей, даглядала гаспадарку, шыла, прала, ткала... Да грошай, можна сказаць, не датыкалася.

Зусім іншыя парадкі цяпер: мусіць, у нямногіх сем'ях даходы-расходы плануюцца разам. У многіх — гаспадыня робіць гэта сама.

Так было ў Сцяпана, так і ў яго сябрука, суседа Антося.

Абодва яны працавалі механізатарамі ў мясцовым саўгасе, абодва марылі хутчэй «дацягнуць» да пенсіі. «Ты чым тады будзеш займацца?» — спытаў неяк Антось. «Ды хацелася б трохі паездзіць, свет паглядзець», — уголас памарыў Сцяпан. — «А мне дык і дома нядрэнна будзе, — падмыргнуў Антось. — Бо я ж рыхтуюся... І даўно. Я цішком ад жонкі грошы адкладваю... У надзейным месцы трымаю. На «дзембель» выйду і ўжо тады...»

Сусед так смачна расказваў, як потым зажыве, як у вольную часіну пад настрой будзе браць бутэлечку, што на тое ж падбіў Антося.

...Ён, трохі старэйшы, на пенсію выйшаў першым. Сцяпан — пазней, але «свет глядзець» не паехаў — жонка не пусціла: усё жыццё адна, можна сказаць, цягнула гаспадарку, а тут вольныя плечы з'явіліся...

Муж, вядома, іх падстаўляў, дапамагаў сваёй Юлі. Праўда, калі цвярозы, бо выпіць яму часцяком здаралася — найперш з сябруком, з Антосем. «І адкуль толькі грошы бяруць?» — не разумеюць часам іх жонкі. А ў мужоў — гатовы адказ:

— У спортлато гуляем. І выйграём!

Жанчыны таксама паспрабавалі: купілі па адным білеціку, па другім, па трэцім... Пуста: не шанцуе. Значыць, хлусяць мужы?

...Крыніца даходаў адкрылася позна ўвосень і зусім нечакана.

Юля ці не 22 разы казала свайму, каб сабачую будку ўцяпліў, а мужу то некалі, то рана яшчэ, то патрэбных цвікоў няма...

Якраз па іх у той дзень і паехаў — у мястэчка, у краму.

Юля ў гэты час вырашыла «ўцяпляльнік» падрыхтаваць: зайшла ў паветку, узяла там старую ватоўку (гады са тры на сцяне правісела), накінула зверху на будку — добрым бокам, благім... Згледзела, што ў адным рукаве падкладка парваная і штосьці тырчыць... Усунула руку — грошы?!

Лічачы іх — дробныя, шмат, — не ведала смяяцца ці злаваць.

А тут і муж «намаляваўся», прычым вясёлы-вясёлы (кульнуў з некім чарку!).

— Што — зноў у латарэйку выйграў? — смехам спытала жонка.

Сцяпан з той радасці:

— А як жа! Мне часцяком шанцуе!

— Але ж, ты казаў, па драбязе... А я сёння во колькі грошай выйграла! — пахвалілася Юля, паказаўшы скрутак...

Сцяпан, — каб не лаўка пры ганку — мусіць, на зямлю абсеў бы... Расстроіўся — страшна!.. Але сварыцца з жонкай не стаў, бо сам жа ва ўсім вінаваты: яшчэ месяц назад мог уцяпліць тую будку. І Бобіку добра было б, і сам бы ўсю зімку грэўся.

Н. Кандрашонак,
г. Петрыкаў.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 382000000067 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 181. Індэкс 63850. Зак. № 631.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 лютага 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12